Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЛІСТАПАДА 2015 г. ЧАЦВЕР № 219 (28077) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Пакаштуем кекс супермамы**

**Дачка Яна Скрыгана ўспамінае**

**Верны спосаб зняць стрэс**

СТАР. 5

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$1 млрд 184,6 млн**

*склала дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі краіны сёлета ў студзені—верасні. Гэта 192,5% да аналагічнага перыяду мінулага года. Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг у студзені–верасні склаўся на ўзроўні $49 млрд 75,6 млн, што на 25,7% менш, чым за студзень–верасень 2014-га. У тым ліку экспарт склаў $25 млрд 130,1 млн (знізіўся на 24,6%), імпарт — $23 млрд 945,5 млн (знізіўся на 26,8%). Сальда знешняга гандлю таварамі склалася адмоўным на ўзроўні $509,9 млн. У студзені—верасні 2014-га гэты паказчык таксама быў адмоўным і складаў $867,8 млн. Сальда знешняга гандлю паслугамі за дзевяць месяцаў склалася дадатным на ўзроўні $1 млрд 694,5 млн, што на 14,2% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.11.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 17648,00 ▲ |
| Еўра | 18958,00 ▼ |
| Рас. руб. | 273,28 ▼ |
| Укр. грыўня | 774,88 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15219

# АРТЭФАКТ З ВЯСКОВАГА ГАРЫШЧА

Фота Анатоля КІЕШЧУКА.

**Падлеткі з вёскі Закальное Любанскага раёна прынеслі ў этнаграфічны пакой клубнага музея «новы» экспанат — самаробную дзіцячую каляску, зробленую адмысловымі майстрамі ў 30-х гадах мінулага стагоддзя. Дырэктар Закальнецкага Дома культуры Надзея МІРЭЙЧЫК радуецца незвычайнаму папаўненню музейнай калекцыі.**

■ Безнаяўны разлік

# БУДУЧАЯ ДЭНАМІНАЦЫЯ ВІРТУАЛЬНЫХ МАХЛЯРОЎ НЕ АКТЫВІЗУЕ

## Эксперты фінансавага рынку: налета ў ліпені не плануюць замены банкаматаў

**Начальнік галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацыянальнага банка Беларусі Аляксандр СОТНІКАЎ упэўнены, што ў сферы безнаяўных разлікаў запланаванае ўзбуйненне нацыянальнай грашовай адзінкі ніяк не паўплывае на бяспеку карыстальнікаў банкаўскімі карткамі. Тэхнічнае абслугоўванне банкаматаў ажыццяўляецца банкамі ў планавым рэжыме, і звычайныя карыстальнікі ўвогуле яго не заўважаюць.**

Спецыяліст упэўнены, што замяняць банкаматы ніхто не будзе. «Атрымаўшы інфармацыю ад Нацбанка аб правядзенні дэнамінацыі, безумоўна, усе беларускія банкі ўжо прыступілі да работы па пераналадцы праграмнага забеспячэння і набыцці для яго неабходных дапаўненняў, каб працаваць з новымі купюрамі», — сказаў прадстаўнік Нацбанка.

Аляксандр Сотнікаў выказаў здагадку, што з 1 ліпеня наступнага года адпаведныя прылады будуць выдаваць у першую чаргу дэнамінаваныя купюры. «З пункту гледжання банкаўскай логікі думаю, што ў кожным канкрэтным банкамаце будуць загружаны банкноты альбо новага, альбо старога ўзору. Наўрад ці будуць выкарыстоўвацца і тыя, і другія купюры адначасова», — выказаў сваю думку кіраўнік галоўнага ўпраўлення. У Нацбанку падлічылі, што выдаткі на падобнае пераабсталяванне будуць адэкватнымі падзеі і дакладна не вельмі вялікімі.

### Нулявая адказнасць працуе на 100%

Сёлета з 5 жніўня ў банкаўскай сферы пачала афіцыйна працаваць норма «нулявой адказнасці». Яна дзейнічае наступным чынам. Трымальнікі банкаўскіх картак павінны на працягу 30 дзён з даты сумніўнага спісання са свайго рахунку грошай іншымі асобамі звярнуцца з адпаведнай заявай у банк-эмітэнт. А апошні на працягу 45 дзён (плацеж быў на тэрыторыі Беларусі) і 90 дзён (спісанне грошай адбылося за межамі) павінен вярнуць незаконна знятыя грошы кліенту. Гэтае рашэнне рэгулятара зняло практычна ўсе праблемныя пытанні ўладальнікаў картак, што ўзнікалі з падобным махлярствам.

Аляксандр Сотнікаў адзначыў, што пасля 5 жніўня Нацбанк увогуле не атрымаў ніводнай скаргі з боку кліентаў на гэты конт. Апошняе сведчыць аб тым, што цяпер айчынныя банкі або вяртаюць кліентам «згубленыя» грошы, ці неяк па-іншаму вырашаюць спрэчныя сітуацыі. Напрыклад, спецыялісты Беларусбанка паведамілі, што ў першы месяц дзеяння гэтай нормы сярод іх кліентаў сустракаліся выпадкі сямейнага (сяброўскага) махлярства, калі ўладальнік карткі сам перадаваў свой «пластык» і пін-код іншым людзям. Пасля высвятлення падобных абставін прэтэнзіі да банка з боку кліента адразу знікалі.

### Адмова ад SMS-апавяшчэння правоў кліента не звузіць

Нагадаю, што менавіта ў жніўні банкі пачалі больш настойліва прапаноўваць сваім кліентам выкарыстоўваць сістэму SMS-апавяшчэння пры любым руху грашовых сродкаў на рахунку ўладальніка карткі. Сёння такая паслуга ў большасці банкаў не бясплатная, а для асобных людзей даволі дарагая. Ці можна ад яе адмовіцца, і чым гэта кліенту пагражае?

СТАР. 3

■ У полі зроку

# КУЛЬТУРА НЕ МОЖА ЦАЛКАМ СЯБЕ ФІНАНСАВАЦЬ,

## але ў Маладзечанскім раёне вучацца зарабляць самастойна

**У наступным годзе Маладзечна стане культурнай сталіцай Беларусі. Дадам, што горад заўсёды называлі некаранаванай сталіцай культуры Міншчыны. Штогод тут праходзіць безліч мерапрыемстваў як мясцовага, так і рэспубліканскага ўзроўняў. Бясспрэчна, без адукаваных прафесійных кадраў, без маральнай і матэрыяльнай падтрымкі з боку ўлады творчыя дасягненні не былі б настолькі значнымі. Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі выязнога пасяджэння Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.**

У хуткім часе ў Беларусі з'явіцца Кодэкс аб культуры. Пасля разгляду ў другім чытанні праект дакумента паступіць у Верхнюю палату — Савет Рэспублікі.

— Нам хацелася больш глыбока вывучыць пытанне на прыкладзе Маладзечанскага раёна, улічваючы, што ў сацыяльнай сферы дзяржава робіць шмат, — канстатаваў **старшыня Пастаяннай камісіі Мікалай КАЗАРАВЕЦ.** — Штогод на сацыяльную сферу выдаткоўваецца 12,5% сродкаў ад валавога ўнутранага прадукту. Гэта вельмі значная сума, і мы павінны разумець, як выкарыстоўваюцца гэтыя асігнаванні. Каля 70% — гэта выдаткі мясцовага бюджэту. Гэта, лічу, вельмі правільна, таму што рэгіянальныя ўлады бачаць праблемы зблізку, разумеюць, куды лепш укладваць грошы.

На рамонт аб'ектаў культуры Маладзечаншчыны летась выдаткавана 2980,8 млн рублёў. Найбольш іх выкарыстана на ўпарадкаванне будынка дзіцячага цэнтра культуры «Расток». Цяпер рамантуецца раённая цэнтральная бібліятэка імя Максіма Багдановіча. Летась былі набыты мікрааўтобус, музычныя інструменты, касцюмы для калектываў мастацкай творчасці, камп'ютарнае, светлавое і акустычнае абсталяванне, мэбля... Райвыканкамам распрацавана рэгіянальная праграма па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцяў на 2012-2016 гады. У гэтым кірунку ўжо шмат зроблена.

— Маладзечанскі раён — адзін з лідараў Мінскай вобласці ў плане культурнага развіцця, — лічыць **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана БАРАНОК.** — Тут многія ўстановы маюць моцную матэрыяльную базу і кваліфікаваныя прафесійныя кадры.

Але, падкрэсліла Святлана Аляксандраўна, культура не можа быць цалкам на самафінансаванні — такога няма нідзе ў свеце. Разам з тым на Міншчыне імкнуцца, каб доля пазабюджэтных паступленняў пастаянна павялічвалася. І ў гэтым плане Маладзечанскі раён паказальны. У сярэднім па вобласці за 9 месяцаў гэтага года колькасць пазабюджэтных паступленняў у агульным утрыманні галіны — 8,3%. У Маладзечанскім раёне — 12,7%. Інакш кажучы, тут самастойна зарабілі 5,2 млрд рублёў. Уменне зарабляць грошы, разуменне таго, за якія культурныя паслугі чалавек можа сёння заплаціць, — гэты вопыт маладзечанцаў варты таго, каб яго распаўсюдзіць у іншых рэгіёнах.

**Культура не можа быць цалкам на самафінансаванні — такога няма нідзе ў свеце. Разам з тым на Міншчыне імкнуцца, каб доля пазабюджэтных паступленняў пастаянна павялічвалася. І ў гэтым плане Маладзечанскі раён паказальны.**

Што датычыцца аптымізацыі, то сёння закрываюцца ўстановы неплацежаздольныя, куды не ідуць людзі, дзе слабыя матэрыяльная база, кадры. У такім выпадку ставіцца пытанне: ці патрэбна такая ўстанова? Установы, дзе ўмеюць працаваць, зацікавіць людзей, маюць права на жыццё. І гэта не толькі паказ канцэртных праграм і тэатральных пастановак. Спектр платных паслуг нашмат шырэйшы: грошы зарабляюць і музеі, і бібліятэкі, і сельскія клубы.

Пытанні кадравага забеспячэння ў галіне культуры знаходзяцца ў полі зроку кіраўніцтва раёна, у тым ліку — замацаванне маладых спецыялістаў, стварэнне ўмоў для іх працы і пражывання. У 2014—2015 гадах у Маладзечна і раён было размеркавана 15 спецыялістаў. І амаль усе яны засталіся тут.

У Маладзечне працуюць дзве сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць спецыялістаў для культурнай галіны: дзяржаўны музычны каледж імя М.К. Агінскага і гімназія-каледж мастацтваў. Пасля іх заканчэння выпускнікі, як правіла, атрымліваюць у далейшым вышэйшую адукацыю ў кансерваторыі, іншых навучальных установах. Праз кожныя пяць гадоў у раёне чакаюць прытоку новых спецыялістаў.

— Мы пад вялікім уражаннем ад таго, як развіваецца культура ў рэгіёне, — падсумаваў вынікі пасяджэння Мікалай Казаравец. — Тут мы не ўбачылі нейкіх глабальных праблем. Пытанні вырашаюцца правільна і эфектыўна. І вопыт Маладзечанскага раёна варта перанесці на іншыя раёны краіны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■

■ Ці чулі?

## ДАПАМОГУ ПА БЕСПРАЦОЎІ ПАВЫСЯЦЬ У ВОСЕМ РАЗОЎ,

### але толькі з 2018 года

**Пра тое, што ў перспектыве плануецца зраўняць выплаты па беспрацоўі з памерам бюджэту пражытачнага мінімуму, паведаміў начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН. «Чаму прынята такое рашэнне? Напэўна, час прыйшоў. Трэба будзе распрацаваць сістэму. Памер дапамогі будзе дыферэнцыравацца ў залежнасці ад прычыны звальнення, выплаты страхавых узносаў. Вядома, на гэта спатрэбяцца дадатковыя грошы», — пракаментаваў спецыяліст.**

Цяпер максімальны памер дапамогі па беспрацоўі складае дзве базавыя велічыні. Бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на чалавека — крыху больш за паўтара мільёна. Адкуль возьмуць неабходныя сродкі, каб з 2018 года зраўняць гэтыя памеры, пакуль не вызначылі. Магчыма, выплаты падымуць за кошт бюджэту ці Фонду сацабароны насельніцтва. Або дапамогу на выпадак незанятасці сабе забяспечаць самі работнікі, за свае грошы (праз ўкараненне механізма страхавання ад беспрацоўя). Варыянты прадставяць перад урадам і ўжо на дзяржаўным узроўні вырашаць, як будзе выглядаць сістэма падтрымкі незанятых грамадзян.

Па словах Алега Токуна, рабіць больш жорсткім падыход да пастаноўкі на ўлік у сувязі з павелічэннем дапамогі не плануецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■

■ Харчовая бяспека

# БАГАТАЯ ВОСЕНЬ

**Уборачная кампанія завяршылася паспяхова, нават нягледзячы на засушлівы год. Харчовая бяспека краіны цалкам забяспечана. Дзяржзаказ па пастаўках збожжа выкананы на 101%. Закладзены стабілізацыйны фонд. Жывёлагадоўля таксама не адстае. Напрыклад, тэмпы росту вытворчасці малака склалі 107% да леташняга ўзроўню, жывёлы і птушкі — 107,1%.**

## ЦВЁРДАЙ ПШАНІЦЫ ЎДОСТАЛЬ

Па словах **намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіміра ГРАКУНА**, краіна забяспечвае сябе пшаніцай цвёрдых гатункаў у неабходных аб'ёмах, таму не будзе яе імпартаваць. «У гэтым годзе мы атрымалі сваю пшаніцу цвёрдых гатункаў у аб'ёмах, якія дазваляюць цалкам забяспечыць мукамольную прамысловасць», — растлумачыў ён. Аднак у Беларусь працягнуць імпартаваць некаторыя напаўняльнікі, напрыклад клейкавіну.

## ЭКСПАРТ З ПЛЮСАМ

Як адзначаюць у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, па выніках 2015 года аб'ём экспарту чакаецца на ўзроўні 2,3 млрд долараў.

Так, па даных на 5 лістапада, экспартавана ўжо больш за 260 тысяч тон бульбы, што больш чым летась, калі была пастаўлена 171 тысяча тон. Морквы было пастаўлена 83 тысячы тон, што больш чым у мінулым годзе на 24 тысячы тон, цыбулі — 16 тысяч тон (у 2014 годзе — 1,8 тысячы тон), бураковў — 14,4 тысячы тон (7 тысяч тон), капусты белакачаннай — 44 тысячы тон (19,5 тысячы тон), таматаў закрытага грунту — 47 тысяч тон (37 тысяч тон), яблыкаў — 32 тысячы тон (14,8 тысячы тон).

Гаворачы аб экспарце жывёлагадоўчай прадукцыі, Уладзімір Гракун адзначыў, што на фоне зніжэння аб'ёмаў экспарту ў коштавым выражэнні не адбылося зніжэння ў натуральным.

«У сувязі са зніжэннем кошту прадукцыі мы недаатрымалі грошы, нягледзячы на павелічэнне аб'ёмаў паставак. Тэмп росту экспарту малака і малакапрадуктаў у натуральным выражэнні за студзень — жнівень 2015-га да аналагічнага перыяду 2014 года склаў 124%, у тым ліку сыроў і тварагу — 113, 9%, сухога абястлушчанага малака — 142,6%, сухога неразведзенага малака — 117,9%, алею — 144,8%, мяса і птушкі — 102,8%», — удакладніў намеснік міністра.

Асноўным рынкам збыту беларускай сельгаспрадукцыі, як і раней, застаецца Расія — каля 80% усіх паставак. «Мы працуем над дыверсіфікацыяй экспарту сельгаспрадукцыі, але і нашы вытворцы павінны разумець, што ім трэба таксама самім шукаць рынкі збыту. Беларусь сёння пастаўляе сваю сельгаспрадукцыю ў 60 краін свету», — растлумачыў Уладзімір Гракун.

## СЕРТЫФІКАТЫ Ў ПАРАДКУ

Пытанняў да фітасанітарных сертыфікатаў беларускай прадукцыі з расійскага боку няма.

«Падробленых беларускіх фітасанітарных сертыфікатаў не было і няма. У Рассельгаснагляда былі пытанні да сертыфікатаў прадукцыі іншых краін, якія пастаўляюцца ў Расію праз Беларусь. Мы працуем з іх фітасанітарнымі службамі практычна па кожным такім выпадку», — адзначыў Уладзімір Гракун.

Былі моманты, калі пацвярджалася інфармацыя аб падробленых сертыфікатах з іншых краін: «У такіх выпадках краіны на месцах праводзяць расследаванне, правяраюць фірмы, якія экспартавалі такую прадукцыю. І ў далейшым гэтыя фірмы мы не пускаем праз Беларусь».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

# ФАКТАР

# КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

## Сёлета Сусветны дзень якасці адзначаецца 12 лістапада і праходзіць пад дэвізам «Якасць — эмоцыі — натхненне»

**У айчынных вытворцаў і спажыўцоў ёсць нагода лічыць сябе непасрэдна далучанымі да міжнароднага свята. «У нашай краіне створана і падтрымліваецца на сучасным узроўні шматпланавая інфраструктура якасці як неад'емны элемент дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Яна ўключае такія напрамкі, як тэхнічнае нармаванне і стандартызацыя, метралогія, ацэнка адпаведнасці і акрэдытацыя, эканомія рэсурсаў, а таксама падтрымка, матывацыя і прасоўванне ідэалогіі комплекснай якасці і дзелавой дасканаласці», — адзначылі ў прэс-службе Дзяржстандарта. З паглыбленнем еўразійскай інтэграцыі і ўступленнем асноўных гандлёва-эканамічных партнёраў у СГА Дзяржстандартам вядзецца работа па пераглядзе асобных законаў на прадмет адпаведнасці патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі». Адпаведныя праекты ўжо распрацаваны і праходзяць працэдуры ўнутрыдзяржаўнага ўзгаднення.**

У Дзяржстандарце таксама адзначылі, што на сёння на стадыі ўнутрыдзяржаўнага ўзгаднення знаходзіцца 11 праектаў тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза (па бяспецы будынкаў і збудаванняў, будаўнічых матэрыялаў і вырабаў, атракцыёнаў, абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак, мінеральных угнаенняў, алкагольнай прадукцыі, рыбы і рыбнай прадукцыі, пакаванай пітной вады і інш.). Яшчэ чатыры праекты праходзяць публічнае абмеркаванне: па бяспецы мяса птушкі, нафты, прадукцыі, прызначанай для абароны насельніцтва пры надзвычайных сітуацыях прыроднага і тэхнагеннага характару, а таксама прадукцыі, прызначанай для грамадзянскай абароны.

Неад'емнай часткай нацыянальнай эканомікі з'яўляюцца стандарты. У рэспубліцы за 9 месяцаў гэтага года прынята больш за 1200 дзяржаўных стандартаў (СТБ і ДАСТ). Важным прынцыпам з'яўляецца гарманізацыя патрабаванняў дзяржаўных стандартаў з міжнароднымі і еўрапейскімі. Так, узровень гарманізацыі штогод складае больш за 60%. Цяпер у нас дзейнічае звыш 25 000 дзяржаўных стандартаў. Забяспечыць прасоўванне айчыннай прадукцыі на знешнія рынкі без дадатковых працэдур ацэнкі адпаведнасці дапамагае Нацыянальная сістэма акрэдытацыі, прызнаная на міжнародным узроўні.

У Дзяржстандарце адзначаюць, што ў нашай краіне за апошняе дзесяцігоддзе праведзена вялікая праца па ўжыванні сістэмнага падыходу да кіравання рознымі аспектамі дзейнасці арганізацый. Так, у арганізацыях рэспублікі сертыфікаваны сістэмы менеджменту якасці па ISO 9001, сістэмы менеджменту бяспекі харчовых прадуктаў на адпаведнасць патрабаванням ISO 22000, сістэмы кіравання аховай навакольнага асяроддзя па ISO 14001 і інш.

Развіваецца рэспубліканскі конкурсны рух у галіне якасці. Сёлета аб'яўлены і праводзяцца конкурсы на саісканне прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі», «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», «Найлепшы менеджар па якасці», «Найлепшая дыпломная і навукова-даследчая праца студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці».

У рамках Еўрапейскага тыдня якасці (9—15 лістапада) і Сусветнага дня якасці арганізацыі Дзяржстандарта ва ўсіх рэгіёнах краіны правядуць каля 70 мерапрыемстваў рознага фармату. Атрымаць адказы на хвалюючыя пытанні можна будзе, звярнуўшыся на прамыя тэлефонныя лініі ў цэнтрах стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі (ЦСМС) у Брэсце, Баранавічах, Барысаве, Віцебску, Гродна, Магілёве. Дні адчыненых дзвярэй і дні якасці правядуць БелДІСС, БелДІМ, БГЦА, Баранавіцкі, Бабруйскі, Барысаўскі, Гродзенскі, Калінкавіцкі, Магілёўскі, Полацкі, Слуцкі ЦСМС, Цэнтр выпрабаванняў і сертыфікацыі ТООТ.

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by) у тэматычным банеры.

**Дар'я ШОЦІК.**

# БУДУЧАЯ ДЭНАМІНАЦЫЯ ВІРТУАЛЬНЫХ МАХЛЯРОЎ НЕ АКТЫВІЗУЕ

Фота Надзеі БУЖАН.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Магчыма, што пасля пісьмовай адмовы ад такой паслугі ўладальнік плацежнай карткі страчвае права карыстацца нормай «нулявой адказнасці»? Пытанні цікавыя, але для спецыялістаў Нацбанка крыху нязручныя. Аляксандр Сотнікаў галасуе за паўсюднае выкарыстанне SMS-апавяшчэння, аднак адмова ад яго «нулявую адказнасць» чалавеку «не закрые».

**1 ліпеня ў кожным канкрэтным банкамаце будуць загружаны банкноты альбо новага, альбо старога ўзору.**

Больш за тое, паводле інфармацыі Нацбанка, тэрмін падачы заявы падаўжаецца, калі ў кліента была ўважлівая прычына — у прыватнасці, калі чалавек хварэў ці знаходзіўся за межамі краіны. Калі такой прычыны няма, то банк можа адмовіцца вяртаць грошы кліенту, які спазніўся з заявай. Могуць адмовіць у кампенсацыі і тым, хто парушыў парадак выкарыстання карткі, з-за чаго ў выніку пазбавіўся грошай. Гэта значыць, калі кліент выявіў прапажу грошай з карткі, то яму абавязкова трэба напісаць заяву і падрабязна выкласці сітуацыю. Спецыялісты банка ўважліва яе вывучаць, каб выключыць верагоднасць падману з боку трымальніка карткі.

## Ставіцца да правілаў сур'ёзна

Наш эксперт упэўнены, што абарона грошай на банкаўскіх рахунках кліентаў у першую чаргу залежыць ад уласнай пільнасці і дакладнага выконвання правілаў карыстання карткамі. Не трэба перадаваць картку іншым асобам, пісаць на ёй пін-код. Пажадана ўважліва разглядаць банкаўскае абсталяванне для самаабслугоўвання, а пры мінімальным падазрэнні не карыстацца ім і г. д. Сёння статыстыка паказвае, што колькасць выпадкаў крадзяжу грошай праз карткі не павялічваецца.

У Еўропе цяпер існуе трэнд на павелічэнне крадзяжоў у «лічбавым» фармаце пры ажыццяўленні пакупак у інтэрнэце. Тут існуе адно простае правіла — для разлікаў у сеціве трэба мець асобную картку, дзе знаходзіцца пэўная сума грошай. А яшчэ пільнымі трэба быць не толькі побач з банкаматамі, але і ўвогуле пры карыстанні любой лічбавай тэхналогіяй. Нельга захоўваць інфармацыю аб картках на сваім камп'ютары ў свабодным доступе, а потым «лазіць» на сумніўных сайтах, на якіх можа дзейнічаць спецыяльная праграма па капіраванні індывідуальнай інфармацыі. Заставацца пільнымі неабходна і ў сацыяльным асяроддзі.

Часам махлярамі выкарыстоўваецца схема абзвону кліентаў у якасці банкаўскіх работнікаў, калі ў кліентаў просяць удакладніць нумар карткі і пін-код. Аляксандр Сотнікаў катэгарычна заяўляе, што ніхто з вашага банка ніколі не будзе пытацца падобную інфармацыю. Ніколі не трэба перапісвацца па «электронцы» ў выпадку атрымання «лістоў шчасця», калі для атрымання грашовага прыза вам прапануюць паведаміць нейкую дадатковую інфармацыю аб банкаўскім рахунку.

## Фінансісты «ў звязцы» з праваахоўнікамі

Актыўнае супрацоўніцтва спецыялістаў МУС і банкаў па прадухіленні махлярстваў з банкаўскімі карткамі пачынае прыносіць станоўчы вынік. **Намеснік начальніка трэцяга аддзела ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Беларусі Алег СЛЕПЧАНКА** паведаміў, што ў апошнія год-два назіраецца зніжэнне ў краіне такога віду злачынстваў, як крадзеж картак і выкарыстанне персанальных звестак карыстальнікаў. Усё гэта тлумачыцца сумеснай прафілактычнай працай з банкамі, якія ў першую чаргу зацікаўлены ў тым, каб грошы іх кліентаў не знікалі з рахункаў.

Эксперт таксама адзначыў, што пад эгідай Нацбанка Беларусі створана рабочая група па прафілактыцы махлярства ў крэдытна-банкаўскай сферы, у склад якой увайшлі і прадстаўнікі сілавых структур. Разам з тым Алег Слепчанка паведаміў, што такога роду махлярства з'яўляецца адным з найбольш высока латэнтных злачынстваў, таму ўплываць на іх на папярэдняй стадыі складана. «Тут, на наш погляд, трэба працаваць наўпрост з кліентамі, і гэта задача ў першую чаргу банкаў».

У Беларусі здзяйсняецца каля 1,5-2 тысяч кіберзлачынстваў за год, з іх каля 90% у апошнія гадоў 5-6 складаюць крадзяжы шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі, у тым ліку каля 1 тысячы злачынстваў прыпадае на крадзеж картак і выкарыстанне персанальных звестак.

**Могуць адмовіць у кампенсацыі і тым, хто парушыў парадак выкарыстання карткі, з-за чаго ў выніку пазбавіўся грошай.**

## Амаль без варыянтаў

Разам з тым у апошнія гады ў нас расце колькасць крадзяжоў з выкарыстаннем банкаўскіх картак у асабліва буйным памеры. Аднак такое павелічэнне сур'ёзных бонусаў крыміналу не дае, бо пераважная большасць гэтых злачынстваў раскрываецца. Алег Слепчанка агучыў апошнія тэндэнцыі падобных крадзяжоў, якія ажыццяўляюцца так званымі кардарамі, што пры дапамозе розных хітрыкаў, у тым ліку тэхнічных, выкрадаюць персанальныя звесткі, вырабляюць фальшывыя карткі і карыстаюцца імі ў інтэрнэце пры аплаце розных паслуг.

Алег Слепчанка звярнуў увагу, што раскрывальнасць падобных злачынстваў у нашай краіне знаходзіцца на вельмі высокім узроўні: «За ўвесь час нашай працы, а гэта ўжо 13 гадоў, лічаныя злачынцы пазбеглі адказнасці. Гэта звязана хутчэй за ўсё з тым, што яны схаваліся за мяжой».

### *Даведка «Звязды»*

Паводле інфармацыі Нацбанка, колькасць банкаўскіх плацежных картак, якія знаходзяцца ў Беларусі ў абарачэнні, сёлета за III квартал павялічылася прыкладна на 2% і перавысіла на дату 1 кастрычніка 12,5 млн адзінак. Доля плацежнай сістэмы «БелКарт» склала амаль 41%. У Беларусі ў абарачэнні таксама знаходзяцца карткі «БелКарт/Maestro», Visa і MasterCard. Усяго ў Беларусі за студзень—верасень 2015 года на тэрыторыі краіны было выканана больш за 685,6 млн аперацый з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак у беларускіх рублях на суму амаль 250,8 трлн рублёў. Удзельная вага безнаяўных грошай у агульнай колькасці аперацый з выкарыстаннем плацежных картак на 1 кастрычніка склала 76%.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# «ЛІСА ЎЦЯКЛА, ПТУШАК ЗАКАПАЛІ БЕЗ ВЫКЛІКУ ВЕТЭРЫНАРАЎ»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З Кобрына ў рэдакцыю па «гарачай лініі» патэлефанавала ўсхваляваная за здароўе сваёй маці Раіса Сяргееўна Барканава. Тыдзень таму на падворак пажылой жанчыны ў вёсцы Залессе Пружанскага раёна завітала ліса, якая, хутчэй за ўсё, была хворая на шаленства...**

*— Маёй маці Валянціне Парфір'еўне Сіплівай — 86 гадоў, яна колішні малалетні вязень. Выйшла ўвечары на падворак і ўбачыла восем забітых курэй, якія ляжалі ў крыві і тушкі якіх яна потым кранала рукамі... Маці нават прытомнасць страціла, а калі прыйшла ў сябе, убачыла непадалёку ў траве рудую лісу. Здаровы звер так сябе не паводзіць. Ды і драпежніцу потым бачылі іншыя вяскоўцы, калі тая бегала па вуліцах, — распавяла наша заяўніца. — У пятніцу маці адвезлі ў бальніцу, дзе зрабілі першыя ўколы ад шаленства, курс якіх трэба працягваць. Але што мяне здзіўляе, дык тое, што на падворку так і не з'явілася санстанцыя, не правяла яго апрацоўку. А ў гаспадарцы ж засталіся яшчэ пяць курэй, якіх маці зараз баіцца выпусціць з хлява, і трусы. Ёсць і котка, якая магла злізаць сліну той лісы на дварэ. Вы ж ведаеце, наколькі гэта небяспечна. Ды і прыбіраў забітых птушак таксама старонні чалавек, сусед, якога маці паклікала на дапамогу. Ніхто іх на экспертызу не браў, ніхто не паклапаціўся, каб зрабіць засаду і злавіць тую лісу. Тэлефаную каторы раз у райвыканкам, там адказваюць, што ўсе меры прынятыя. Дык дзе ж прынятыя?*

Далей Раіса Сяргееўна расказала, што, каб зрабіць уколы, маці даводзіцца ездзіць у Пружаны. Для старога чалавека гэта вельмі цяжка, прыходзіцца наймаць чужых людзей і плаціць ім за гэта грошы. «Чаму б, улічваючы стары ўзрост і статус малалетняга вязня маёй маці, урачам самім — чыста па-чалавечы — не прыязджаць да яе з тымі ўколамі? Ці хаця б перадаць іх у амбулаторыю, што знаходзіцца ад вёскі значна бліжэй, чым Пружаны — у нейкіх дзесяці кіламетрах?»

Каб разабрацца ў сітуацыі, мы звязаліся з **галоўным урачом Пружанскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Эдвардам ЛАГУНОМ.**

— Маці вашай заяўніцы прайшла курс лячэння ў хірургічным аддзяленні раённай бальніцы, засталося зрабіць яшчэ два ўколы і трэці — праз месяц. Сапраўды, улічваючы паважаны ўзрост пацярпелай жанчыны і тое, што яна цяжка пераносіць дарогу, учора сумесна з адміністрацыяй цэнтральнай раённай бальніцы было прынята рашэнне, што апошнія ўколы з курса будуць зроблены ёй ва ўрачэбнай амбулаторыі агульнай практыкі, размешчанай бліжэй да вёскі Залессе. Засталося толькі перадаць туды вакцыну.

Згодна з санітарнымі інструкцыямі, апрацоўка падворку ў такіх сітуацыях не праводзіцца. Ліса ўцякла, забітых курэй закапаў сусед. Так, гэта павінны былі зрабіць ветэрынарныя ўрачы, але калі яны даведаліся пра здарэнне, — наўпрост да іх ніхто не звяртаўся, паведамленне прыйшло з райвыканкама — справа, як той казаў, была зроблена. Але сусед зрабіў усё правільна, з захаваннем мер бяспекі — закінуў у мех тушкі вілами.

Чаму не забралі забітых курэй на экспертызу, каб устанавіць, ці сапраўды ліса была хворая на шаленства? Для гэтага патрэбна галава жывёлы. Тушкі птушак для гэтых мэт не падыходзяць па той прычыне, што ў іх можа змяшчацца малая доза таксінаў.

Па словах Эдварда Лагуна, у лясгас адпраўлена прадпісанне аб адстрэле лісы, а ў сельсавет — аб абыходзе падворкаў і папярэджанні насельніцтва аб неабходнасці вакцынацыі свойскай жывёлы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# МАЁМАСНЫЯ ПАДАТКІ — ПА «ЭЛЕКТРОНЦЫ»

## Сёлета аплаціць іх трэба да 16 лістапада

**Паводле інфармацыі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі па г. Мінску, спецыялісты падатковай галіны правялі ў сталіцы ўлік фізічных асоб — плацельшчыкаў зямельнага падатку, арэнднай платы за зямельныя ўчасткі і падатку на нерухомасць у 2015 годзе. Сёння ў Мінску зарэгістравана больш за 149 тысяч такіх падаткаплацельшчыкаў.**

Як паведаміла карэспандэнту выдання **намеснік начальніка гарадской інспекцыі — начальнік упраўлення падаткаабкладання арганізацый Вольга КІШКО**, ужо больш за 900 жыхароў сталіцы сёлета атрымалі паведамленні на аплату маёмасных падаткаў электронным спосабам. Суразмоўца нагадала, што гэта актуальна для тых грамадзян, якія ў першую чаргу выбіраюць зручнасць і рацыянальнае выкарыстанне свайго часу, а таксама для тых, хто жыве за межамі Беларусі або не пражывае па-за месцам рэгістрацыі.

Грамадзяне, якія атрымалі паведамленні ў электронным выглядзе, і разлічыцца з бюджэтам таксама могуць электронным спосабам у раздзеле «Аплата падаткаў» у «Асабістым кабінеце» на партале МПЗ з выкарыстаннем падключаных паслуг інтэрнэт-банкінгу Беларусбанка або Белгазпрамбанка.

Варта звярнуць увагу, што сёлета канчатковы тэрмін аплаты плацяжоў за зямлю і падатку на нерухомасць прыпадае на 16 лістапада ўключна. У інспекцыі раяць аплачваць гэтыя падаткі своечасова. А ахвотным налета атрымліваць паведамленні і аплачваць маёмасныя падаткі электронным спосабам неабходна звярнуцца з пашпартам у любую інспекцыю горада для пацверджання пераходу на новы фармат і атрымання ідэнтыфікацыйнага кода і пароля для працы ў «Асабістым кабінеце».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## УВАГА, «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»!

**14 лістапада, у суботу,** у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца «прамая лінія» **з намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі Мікалаем Аляксандравічам МЕЛЬЧАНКАМ.**

Пытанні, якія тычацца асабістай і маёмаснай бяспекі, своечасовага рэагавання на паведамленні аб правапарушэннях, прафілактыкі злачынстваў, аказання ахоўных паслуг, працы Дзяржаўтаінспекцыі, можна будзе задаць **з 10 да 12 гадзін** па тэлефоне **(8017) 2871871.** Папярэдне вы зможаце іх пакінуць па нумары **(8017) 2871751** альбо даслаць на электронную скрыню **zhurnalist155@gmail.com** з пазнакай «Прамая лінія».

## ЗАВОЧНАЯ ПРАМАЯ ЛІНІЯ

### Жывём з алергіяй

Чаму ў адных імунная сістэма працуе добра, а іншых падводзіць? Што такое імунітэт і адкуль бярэцца алергія? Праблему алергіі — атапічнага дэрматыту, бранхіяльнай астмы і іншых захворванняў — можна абмеркаваць у рамках нашай **завочнай «прамой лініі» з галоўным пазаштатным дзіцячым алерголагам Міністэрства аховы здароўя, кіраўніком Рэспубліканскага цэнтра алергалогіі дзіцячага ўзросту, загадчыкам кафедры паліклінічнай педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктарам медыцынскіх навук, прафесарам Уладзімірам Фёдаравічам ЖАРНАСЕКАМ.**

Да **17 лістапада** пакідайце, калі ласка, свае пытанні па **нумары рэдакцыі 8 017 287 18 29** (Святлане Барысенцы) або дасылайце на **электронную пошту: info@zviazda.by**

■ Дзяржава і бізнес

# «КАТАЛІЗАТАР» ІНФРАСТРУКТУРЫ

## У Мінэканомікі ацанілі патрэбы краіны ў інфраструктурных інвестыцыях да 2030 года на ўзроўні больш за 60 млрд долараў

Фота БЕЛТА.

**Дэфіцыт рэсурсаў на развіццё інфраструктуры з 2016 па 2020 год у сваю чаргу ацэньваецца ад 1,6 млрд да 2 млрд долараў у год. Выхад з гэтай сітуацыі дапаможа знайсці прыняцце закона «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве». Па словах намесніка міністра эканомікі Аляксандра ЗАБАРОЎСКАГА, прававое асяроддзе для рэалізацыі законапраекта ўжо гатова. Неўзабаве ён будзе вынесены на разгляд у парламент у другім чытанні. Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Андрэа Віктарын у сваю чаргу адзначыла, што ён яшчэ на этапе сваёй падрыхтоўкі стаў адным з самых паспяховых праектаў, фінансуемых ЕС у Беларусі.**

### СПЕЦЫЯЛІСТЫ Ў ДЭФІЦЫЦЕ

У Беларусі вызначаюць далейшыя крокі развіцця перспектыўнага кірунку. Напярэдадні ў рамках міжнароднай канферэнцыі Міністэрства эканомікі Беларусі і федэральны цэнтр праектнага фінансавання Знешэканамбанка Расіі падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве ў сферы дзяржаўна-прыватнага партнёрства (ДПП). Абодва бакі плануюць разгледзець усе праекты і выбраць тыя, што змогуць паспяхова рэалізаваць сумесна. Было падпісана і пагадненне аб супрацоўніцтве паміж навукова-даследчым эканамічным інстытутам Мінэканомікі Беларусі і казахстанскім цэнтрам дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Акрамя таго, Аляксандр Забароўскі адзначыў, што актыўна абмяркоўваецца магчымасць стварэння ў структуры Банка развіцця фінансавага падраздзялення, якое будзе займацца пытаннямі ДПП.

«Гэтую магчымасць мы запазычылі з вопыту расійскіх калег. Плануецца, што банк, які займаецца доўгатэрміновымі інфраструктурнымі праектамі, будзе мець у сваім падраздзяленні і адпаведны цэнтр», — растлумачыў намеснік міністра. Такія прапановы Мінэканомікі і Мінфін ужо падрыхтавалі, і яны цяпер знаходзяцца ў стадыі разгляду. Аляксандр Забароўскі лічыць, што важным пытаннем у развіцці ДПП з'яўляецца падрыхтоўка кадраў: «Сёння ў Беларусі ёсць ужо больш за 300 дыпламаваных спецыялістаў у разглядаемай сферы, але гэтага недастаткова. Хутка ў Мінэканомікі мы абмяркуем, якія практычныя крокі трэба зрабіць, каб гэта выправіць».

### ЭКСПЕРТЫ АДЗНАЧАЮЦЬ ПРАГРЭС

Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Андрэа Віктарын лічыць, што за тры гады ў Беларусі назіраецца значны прагрэс у развіцці ДПП. На яе думку, пра гэта сведчыць тое, што закон будзе прыняты даволі хутка. «Вельмі важна вызначыць, як далей будзе развівацца інстытут ДПП у вашай краіне. Варта адзначыць, што шэраг нашых рэкамендацый Беларусь ужо выканала», — канстатавала Андрэа Віктарын.

У сваю чаргу выканаўчы сакратар ЕЭК ААН Крысціян Фрыс Бах лічыць, што дзяржаве неабходна прыцягваць прыватныя інвестыцыі ў будаўніцтва сацыяльнай інфраструктуры. Гэта дазволіць эфектыўна рэалізаваць Мэты ўстойлівага развіцця, якія нядаўна прынялі лідары 150 краін свету. Іх дасягненне мае на ўвазе рост дабрабыту краін і прадугледжвае выкарыстанне інвестыцый прыватнага сектара.

«Беларусь актыўна дзейнічае ў гэтым кірунку, заняўшы вядучыя пазіцыі ў стварэнні інстытуцыйнай інфраструктуры для развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства. У парламенце на разглядзе знаходзіцца закон аб ДПП. Працягваючы працаваць у гэтым напрамку, Беларусь зможа прыцягнуць неабходную колькасць рэсурсаў для свайго развіцця» , — канстатаваў Крысціян Фрыс Бах.

### УСЕ БУДУЦЬ ВЕДАЦЬ, ЗА ШТО АДКАЗВАЮЦЬ

У законапраекце дзяржаўна-прыватнага партнёрства вызначаць прававы рэжым маёмасці і крыніцы фінансавання.

«Менавіта пагадненне аб ДПП з'яўляецца тым галоўным дакументам, дзе прапісаны абавязацельствы бакоў, дакладна вызначаны механізмы вырашэння спрэчак. Акрамя таго, законам рэгламентавана сфера кампетэнцый удзельнікаў», — растлумачыў Аляксандр Забароўскі.

Ён адзначыў, што за апошнія 5 гадоў ні адзін з праектаў, што развіваецца ў краіне ў сферы эканамічнай палітыкі, не прайшоў такі ўсебаковы і комплексны разгляд, як законапраект ДПП: «Мы, як распрацоўшчыкі і ўдзельнікі гэтага працэсу, стараліся выкарыстоўваць у нацыянальным прававым полі найлепшыя сусветныя практыкі, вопыт перадавых краін».

### ЗУСІМ НЕ ДАБРАЧЫННАСЦЬ

Паводле слоў першага намесніка міністра фінансаў Максіма Ермаловіча, каб супрацоўніцтва бізнесу і дзяржавы было эфектыўным, у краіне неабходна зрабіць эфектыўную, малавыдаткавую і антыкарупцыйную фінансавую мадэль ДПП.

«Фінансавая мадэль мае вялікае значэнне. Інвестар прыходзіць з інвестыцыямі ў інфраструктуру з адной мэтай — максімізаваць свой прыбытак. У дзяржаўнага бюджэту мэта іншая — мінімізаваць фінансавыя затраты, рызыкі, звязаныя з рэалізацыяй праекта. Дзяржаўна-прыватнае партнёрства — гэта не дабрачыннасць», — адзначыў Максім Ермаловіч.

Ён таксама лічыць, што трэба зрабіць метадалогію параўнання выдаткаў, якія дзяржава панясе ў выпадку, калі б рэалізоўвала праект самастойна і з удзелам прыватнага інвестара. Калі выдаткі меншыя, то праект дзяржава рэалізуе сама. У іншым выпадку ён будзе рэалізаваны на прынцыпах ДПП.

«Мы чакаем, што мадэль дасць магчымасць стымуляваць інвестара, калі ён аказвае больш якасныя паслугі, і, наадварот, караць, калі паслугі прадастаўляюцца няякасна», — удакладніў першы намеснік міністра.

Максім Ермаловіч адзначыў, што ў ходзе работы над пілотным праектам ДПП па рэканструкцыі дарогі М10 высветлілася, што дастаткова складана структураваць фінансавую частку распрацоўкі тэхнічнага задання для міжнароднага конкурсу.

«Найлепшым інструментам для такой працы будзе стварэнне спецыяльнай фінансавай структуры ў Банку развіцця, якая стане адказваць за аналіз праектаў з боку дзяржавы», — лічыць ён.

Рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты будуць несці нагрузку, звязаную з кампенсацыяй як капітальных, так і бягучых выдаткаў прыватнага інвестара, які рэалізуе праект ДПП.

«Гэтую магчымасць дае мандат на фінансаванне расходаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, якога да гэтага часу не было. Цяпер кожная вобласць, кожны раён атрымае права прадугледжваць у рамках свайго бюджэту сродкі на кампенсацыю выдаткаў інвестара і на фінансаванне бягучай дзейнасці», — растлумачыў Максім Ермаловіч.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Свой погляд

# ХТО ДБАЕ, ТОЙ І МАЕ!

**Што ні кажы, а мудрасць продкаў не страціла сваёй актуальнасці. І малапісьменныя дзяды-прадзеды ў нечым былі разумнейшыя за нас, узброеных інтэрнэтам і сучаснымі гаджэтамі. Процьма цяперашніх псіхолагаў, сацыёлагаў ды іншых «-олагаў» б'ецца над рэцэптам поспеху. Пішуць кнігі і ладзяць семінары на тэму, як стаць багатым і рэалізавацца ў жыцці. Хаця нашыя прашчуры на гэтае пытанне даўно знайшлі адказ. І ўвасабляецца ён у простай ісціне: хто дбае, той і мае.**

Бяда толькі, што гэтая ісціна, бы горкая таблетка, не ўсім даспадобы. Адусюль чуеш толькі нараканні, як цяжка жыць. І камяні збольшага ляцяць у «агарод» дзяржавы. Маўляў, не забяспечвае належнага ўзроўню дабрабыту. А ў Еўропе вунь якія заробкі! І дапамога па беспрацоўі і шматдзетнасці такая, што можна жыць і не журыцца. А ў нас з тых, хто не працуе, падатак спаганяць збіраюцца. Дзе справядлівасць?!

Прычына гэтага абурэння нават не ў эканоміцы. Чамусьці ў нас склалася спецыфічнае ўяўленне пра абавязкі дзяржавы. Для нас дзяржава — гэта не структура, што абслугоўвае грамадства, а ці то мамка, ці то нянька, якая мусіць бегаць за кожным, глядзець, каб галавой не выцеўся, і задарма карміць цукеркамі. А тут з дзяржаўных трыбун адкрытым тэкстам заяўляюць, што на цукеркі спачатку трэба зарабіць. І гэта слушны падыход. Не толькі з пункту гледжання эканомікі, але і псіхалогіі. Педагогі не дадуць схлусіць: празмерная апека замінае развіццю самастойнасці. А ў маштабах краіны спараджае масавую інертнасць. У людзей знікае ініцыятыўнасць. А менавіта на ініцыятыве трымаецца сучасны рынак. Аднак паўстае класічнае пытанне: што даць чалавеку — рыбу ці вуду?

Заходняя Еўропа, на якую ківаюць нашы дамарослыя аналітыкі, ужо даўно раздае «рыбу». Вялікія сацыяльныя дапамогі, выплаты шматдзетным сем'ям ды іншыя сацыяльныя «пернікі». Каб чалавек не застаўся сам-насам са сваёй бядой. І дапамога па беспрацоўі ў іх сапраўды большая, чым у многіх з нас заробкі. Але не спяшайцеся зайздросціць. Вялікія сацыяльныя гарантыі рана ці позна выклікаюць не меншыя сацыяльныя праблемы. Так, карэнны немец-працаголік саромеецца жыць з дзяржаўнае ласкі. А вось натоўпы мігрантаў трымаюцца іншай думкі. Навошта гараваць на працы, калі можна гадамі сядзець на «сацыялцы» і анічога не рабіць? (Акрамя, хіба што, новых дзяцей.) А немец, француз ці які швед няхай сабе працуюць і плацяць шалёныя падаткі. Стары добры сацыяльны паразітызм. Накшталт таго, што квітнеў яшчэ ў Старажытным Рыме, калі тысячы людзей сядзелі на карку ў дзяржавы. Бо працаваць для свабоднага чалавека было маветонам, і дзяржаўныя людзі мусілі рупіцца пра тое, каб пракарміць натоўп беспрацоўных, але страшэнна гордых сабой грамадзян. Тады хлеб і відовішчы забяспечваліся за кошт завяванні новых земляў. У наш час такі аўкцыён нечуванай шчодрасці магчымы пры наяўнасці прыродных рэсурсаў: нафты, золата, алмазаў... Але краіны, якім гэтак пашанцавала, можна палічыць на пальцах адной рукі.

У НАС нафта не б'е з-пад кожнай купіны. Таму чакаць, што дзяржава забяспечыць усім і кожнаму салодкае жыццё, не выпадае. Дый і не павінна яна гэтага рабіць. Яе справа — забяспечваць парадак і стабільнасць. Каб у грамадзян не вытрасалі кашалькі і мабільнікі ў цёмных завуголлях. А яшчэ — стварацъ умовы, каб людзі маглі зарабляць грошы. І дапамагаць тым, хто з аб'ектыўных прычын не можа сябе забяспечыць.

Але ж не: «песні жальбы» заводзяць акурат маладыя, здаровыя і працаздольныя. Маўляў, я вось такі разумны і адукаваны, а мне так мала плацяць. І як выснова — «ва ўсім вінаватая дзяржава». Але давайце прыгадаем, як яшчэ нядаўна жылі нашы сялянскія продкі. Ім ніхто не плаціў нават пенсій. Усё, што яны мелі, было з уласнага мазаля. І дабрабыт здабываўся цяжкай працай ад світання да змяркання. А «ўсё ўзяць і падзяліць» — сапраўдным гаспадарам нават у галаву не прыходзіла. Усё, што зарабіў, — тваё. Хто дбае, той і мае.

СУЧАСНЫЯ пакаленні не зведалі і дзясятай часткі таго, што выпала на долю нашых дзядоў і бабуль. Мы не бачылі вайны і голаду. Не гнулі спіны за працадні. Не ведаем, што такое дэфіцыт і цісканіна ў чэргах. Мы можам свабодна ехаць у любую краіну свету. Але і запатрабаванні нашы выраслі. Мы хочам усё большых выгод. Але... з мінімальнымі высілкамі. Толькі дзе сказана, што дзяржава павінна задавальняць усе нашыя хаценні? Чалавечыя патрэбы растуць бясконца, а дзяржаўная кішэнь не бяздонная. Яна можа забяспечыць мінімальны ўзровень дабрабыту. Не даць табе апусціцца на самае дно. А калі ты хочаш ездзіць не на аўтобусе, а на машыне, і жыць не ў «панэльцы», а ў катэджы, то гэта, даражэнькі, твае праблемы. Хочаш быць багатым — працуй. Рукамі або галавой. Пацікаўцеся, колькі гадзін на суткі шчыравалі амерыканскія мільярдэры, каб займець свой першы мільён.

**Мы хочам усё большых выгод. Але... з мінімальнымі высілкамі. Толькі дзе сказана, што дзяржава павінна задавальняць усе нашыя хаценні?**

«Але ж за мяжой зусім іншыя ўмовы! Не тое, што ў нас...» — запярэчаць мне. Адвечная песня на тэму, што «добра там, дзе нас няма». Так, у нас не ўсё ідэальна. Але свае «падводныя камяні» ёсць у любой сістэмы. Некалі адна мая зямлячка паехала ў Ізраіль да сваякоў. Пагасцяваць і трохі грошай падзарабіць. А то і застацца назаўсёды, калі пашанцуе добра ўладкавацца. І ўладкавалася — на фабрыку мясных паўфабрыкатаў. Трапіла ў цэх, дзе ўручную круцілі нейкія галубцы. І вось там колішняя савецкая жанчына пабачыла, што такое «ашчэр капіталізму». Ніякіх перакураў і піцця гарбаты па дзесяць разоў на дзень. Кожныя дзве гадзіны — рэгламентаваны перапынак на пятнаццаць хвілін. І пасярод дня — паўгадзіны на абед. Увесь астатні час — няспынная праца. Калі аднойчы пасярод працэсу з непрывычкі папруцянелі рукі, яна вырашыла хвілін пяць адпачыць. Проста ля канвеера. Але ўжо праз дзесяць секундаў над яе галавой «ажыў» дынамік: «Што здарылася? Чаму вы не працуеце?» У выніку яна не вытрывала і праз пару тыдняў звольнілася. Хоць нават па ізраільскіх мерках там плацілі добра. І такіх гісторый, калі людзі вярталіся з замежжа, не знайшоўшы сябе ў іншай сістэме, — колькі заўгодна.

Але і ў нас ёсць тыя, хто зарабляе немалыя грошы. Купляюць дарагія машыны, будуюць асабнякі. Асабіста ведаю некалькіх такіх. І не зайздрошчу ім. Бо яны па дванаццаць-пятнаццаць гадзін на суткі думаюць выключна аб працы. І з тэлефонам не расстаюцца нават у водпуску. А часу на тое, каб ныць у сацыяльных сетках, як усё вакол кепска, у іх папросту няма. Бо гэтыя людзі працуюць. Дбаюць і маюць.

Каб нечага дамагчыся, трэба быць сталай асобай, а не вечным дзіцём. Рабіць уласны выбар і несці за яго адказнасць. І не вінаваціць у сваіх няўдачах неспрыяльныя абставіны. Перашкоды ёсць заўсёды. Але ж нехта дасягае поспеху і насуперак ім. Або не дасягае. Бо ўсё, што адбываецца з намі, — гэта вынік нашага выбару. Ісці вучыцца на філолага ці на бетоншчыка? Сядзець у кабінеце або «тырчаць» на будоўлі? Марнець на абрыдлай, але звыклай працы, ці шукаць новую? Несці свае зберажэнні ў банк, укладваць іх у бізнес ці пхаць дома пад матрац?

КОЖНЫ з варыянтаў па-свойму рызыкоўны. Банк можа «пагарэць», бізнес — «накрыцца медным тазам», а ў хату можа ўлезці злодзей. Жыццё ў сучасным свеце ў прынцыпе рызыкоўнае. То крызіс грымне, то скарачэнне штатаў. Але гэта непазбежная плата за свабоду — асабістую і эканамічную. Свабоду, пры якой ніхто нікому нічога не вінен. І нічога лепшага пакуль ніхто яшчэ не прыдумаў. Лад, пры якім дзяржава ўсімі апякуецца і ўсім забяспечвае аднолькавы дабрабыт, мы ўжо паспрабавалі збудаваць. Вынікі гэтага эксперымента ўсім вядомыя.

**Валянцін БОЙКА**

Сямейная газета

Выпуск № 18 (41)

Фота Надзеі БУКАН

## УСЁ НЕ ТАК, ЯК ЗДАЕЦЦА

На днях сястра паляцела ў Амерыку. Да мужа. Праз два гады пасля вяселля... Увесь гэты час «наша дзекабрыстка» ціха плакала ў падушку і жалілася на лёс. Маўляў, чаму ён не адпускае яе да каханага? Чаму так доўга цягнуць з візай? За што такая несправядлівасць? І вось на днях, калі ўсе сваякі сабраліся за сталом, каб праводзіць Наташу за акіян, яна здзівіла. «Ведаеш, — кажа, — я ўдзячна лёсу, што так доўга не адпускаў мяне... Бо, як медык, больш патрэбна была тут, побач з мамай, жыццё якой аказалася пад пагрозай...»

Усе два гады сястра пыталася «за што?». А цяпер разумее, «навошта».

Гадоў пяць таму, як гром сярод яснага неба, раздаўся тэлефонны званок. Паведамілі, што сяброўка, з якой мы тады дзялілі адзін пакой, трапіла пад машыну. У той вечар яна вярталася з дзіцячага анкацэнтра, дзе займалася валанцёрствам. У маёй галаве не ўкладалася, як з такім светлым чалавекам магла здарыцца бяда. Таня таксама, відаць, у той момант не разумела гэтага. Магчыма, крыўдзілася на лёс, пыталася, за што ён паслаў ёй такія выпрабаванні. І толькі пасля, праз нейкі час, мы зразумелі, «навошта».

Ніколі не забудуся, як незадоўга да аварыі сяброўка вярнулася ад свайго кавалера са слязамі, заракалася больш з ім не бачыцца. «Сумна мне з ім, нецікава!» Але, калі здарылася бяда, менавіта той нецікавы і сумны Сяргей аказаўся самым надзейным і клапатлівым. Ён прыходзіў да Тані ў палату штодзень, даглядаў яе. Не шкадаваў ні часу, ні грошай. Як гэта ні дзіўна гучыць, але менавіта аварыя дала магчымасць сяброўцы разгледзець і не прапусціць свой лёс. А Сяргею праявіць сябе з іншага боку, раскрыцца.

...Два анёлы (адзін больш вопытны, а другі зусім «зялёны») спусціліся на зямлю, ператварыліся ў людзей і пайшлі. Увечары яны папрасіліся пераночыць у адным багатым доме. Трэба сказаць, што гаспадары, хоць былі і заможныя, гасцей не любілі. З дому на ноч выганяць, праўда, не сталі, але і паесці не прапанавалі, а спаць адправілі ў халодны падвал. Пакуль рассцілалі ложак, старэйшы анёл убачыў дзірку ў сцяне і заклаў яе. Малодшы пытаецца: «Для чаго?» «Усё не так, як здаецца...» — адказаў мудры анёл. Ішлі яны, ішлі. І на наступную ноч спыніліся ў зусім бедным доме. Муж з жонкай раздзялілі з імі сціплую вячэру і прапанавалі свае ложкі, каб госці выспаліся. А раніцай, калі анёлы прачнуліся, убачылі, што гаспадары горка плачуць. Іх адзіная карова, малако ад якой карміла ўсю сям'ю, ляжала мёртвай у хляве. Малодшы анёл запытаўся ў старэйшага: «Як жа так, учора мы ночылі ў гаспадароў, у якіх усё было, а ты ім дапамог. А ў гэтых добрых людзей наогул амаль нічога няма, а ты дазволіў, каб у іх памерла адзіная карова. Чаму?» «Усё не так, як здаецца... — усміхнуўся бывалы анёл. — Калі мы ночылі ў падвале, я ўбачыў праз дзірку ў сцяне скарб. Але гаспадары абышліся з намі не надта гасцінна, і я адрамантаваў сцяну, каб яны не вельмі хутка знайшлі тое золата. А сёння ноччу, пакуль усе спалі, прыйшоў анёл смерці па жонку гаспадара, і я яго ўгаварыў забраць замест жанчыны карову. Я ж табе казаў: тут усё не так, як здаецца...»

Таму цяпер, калі ў мяне здараецца няшчасце, я сто разоў падумаю, перш чым скардзіцца на свой лёс ды павярхоўна меркаваць аб тым, што адбываецца. Бо жыццё ўжо неаднаразова паказвала-даказвала, мы ніколі не ведаем усяго...

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

■ Супермама-2015

# КАРЖОВА — ГЭТА НЕ ПСЕЎДАНІМ

Цудоўная гісторыя пра тое, як украінская дзяўчына знайшла сваё шчасце ў Беларусі, стала маці трох прыгожых дачок і навучылася ствараць шэдэўры з цеста

**Сабраць шматдзетную сям'ю Каржовых разам аказалася задачай складанай. Таццяна прыйшла на сустрэчу са старэйшай дачкой і адразу ж папярэдзіла: праз паўгадзіны ў Машы пачынаюцца заняткі па музыцы, і ім неабходна там быць. У пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Супермама-2015» увесь дзень распісаны па хвілінах. Праца, дом, дзеці. А ў дзяцей — гурткі, музычная школа. І трэба не толькі своечасова іх туды завесці, але і забраць. Муж дапамагае, але ён таксама чалавек заняты. Вось і даводзіцца рабіць усё ў тэмпе вальса. А часам і танга. Як на конкурсе «Супермама», дзе Таццяна Каржова разам са сваім сужэнцам Максімам замешвалі цеста ў рытме палкага танца. У белых фартухах на фоне вялізарнага торта, дзе ў стылі 3D-Mapping была праілюстравана гісторыя іх сям'і, яны выглядалі неверагодна.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Будзем знаёмы!

# ПЕРШАЕ СЯБРОЎСТВА

**Многія дарослыя лічаць, што дзіцячая дружба — рэч не сур'ёзная. Маўляў, сёння адзін сябар, заўтра іншы. Да пэўнага часу і я сумнявалася ў моцы сяброўскіх пачуццяў дашкалят. Пакуль мой трохгадовы сынок не пераканаў мяне ў іншым.**

Да дзяцей Даня цягнуўся з першых дзён, як пачаў добра хадзіць. Нават калі ён не гуляў з імі, усё роўна трэба было круціцца побач. Паступова ў яго з'явіліся адразу два сябры — Ромы-аднагодкі. Два гады, амаль дзень у дзень, мы сустракаліся з імі на дзіцячай пляцоўцы, бавілі разам час. Хапала ўсяго: і біліся, і абдымаліся, і цацкі адзін у аднаго забіралі, адным словам, сябравалі. Нават мы, мамы і таты, зблізіліся, хадзілі ў госці, даглядалі дзяцей адно аднаго.

Але прыйшоў нам час пераехаць на новую кватэру, і з Ромамі Даня развітаўся. Што тут пачалося! Ён бясконца пытаўся ў мяне, калі мы зноў паедзем да Раманаў, на вуліцы сярод чужых дзяцей намагаўся ўбачыць сваіх любых сяброў. Прайшоў год, і ўсё роўна кожны раз, як мы прыязджаем на былую кватэру — наведваем бацькоў, — Даня адразу ўсклікае: «Я тут з Ромамі гуляў!»

Аднойчы мы выпадкова сустрэліся з адным з Раманаў. На тварыку майго дзіцяці адразу з'явілася ўсмешка, але ён застыў у нерашучасці і пазіраў на мяне. «Так, гэта Рома!» — пацвердзіла я. І Даня імгненна пабег да сябра. «Прывітанне! Рома, гэта я!» — усхваляваная вымавіў ён. Але Рома нават не ўсміхнуўся, толькі наставіў на сына дзіцячы пісталет. «Рома, гэта я, Даня», — не адступаў мой. І паспрабаваў абняць хлопчыка. Але той адхіліўся ўбок, і зноў перад тварам з'явілася «пушка». «Забыўся», — зразумела я. І, убачыўшы, што Даня расчараваны і не ведае, што рабіць далей, пацягнула яго хуценька на іншую пляцоўку. Ніякіх пытанняў ад сына я не пачула, але на наступны дзень ён сур'ёзна заявіў: «Мабыць, Рома быў у дрэнным настроі. Яму не спадабалася мая новая прычоска». Маё сэрца заныла ад жалю. Як растлумачыць майму звышадчувальнаму малому, што жаданне сябраваць не заўсёды ўзаемнае? Як маці мне стала крыўдна, што шчырыя пачуцці Дані былі ўспрыняты абыякава. Ды што зробіш, сябраваць не прымусіш.

Хутка нам прыйшоў час ісці ў дзіцячы садок. Даня туды збіраўся, як на свята. «Там шмат дзяцей! Ты знойдзеш новых сяброў», — расказвала я яму пра садок. І неўзабаве сапраўды дома мы пачулі пра новага сябра сына. Даня называў яго «пажарны», бо ў таго была чырвоная бейсболка. І па расказах сына я зразумела, што абодвум вельмі даспадобы гэтая гульня ў ратавальнікаў ад агню. У іх нібы была брыгада, і яны ўсім дапамагалі ў бядзе. Даня так захапіўся, што прыйшлося і яму набыць чырвоную кепку. Праз пэўны час мы даведаліся, што хлопчыка завуць Акім, але ж дома ў размове ён так і застаўся «пажарным». Даня вельмі прывязаўся да новага сябра. Цяпер усе новыя цацкі ён абавязкова нёс у дзіцячы садок, каб пагуляць у іх разам з «пажарным», вельмі часта ўзгадваў яго ў размовах, вылучаў сярод іншых дзяцей у садку і хацеў запрасіць пагуляць дадому.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

# МОЦНАЯ ЖАНЧЫНА

## Як жыве сям'я, у якой маці ахвяравала сыну нырку

**Алена з Сашам сустрэлі мяне на аўтавакзале. Да іх дома мы прайшлі праз цэнтральную частку Ружан, мястэчка з даволі багатай гісторыяй. Па дарозе маці і сын паказвалі не так даўно адрэстаўраваны сквер, дзе стаяць драўляныя скульптуры каралевы Боны ды іншых гістарычных асоб. Раптам у Сашы ў тэлефоне патрабавальна зазвінеў будзільнік. Аказалася, гэта напамін пра час прыёму таблетак.**



### Пачала зноў хадзіць дзякуючы сыну

Пасля перасадкі ныркі прайшло два з паловай гады. За гэты час жыццё хлопца з Ружан істотна змянілася. А да аперацыі тры разы на тыдзень трэба было ездзіць у суседні райцэнтр на працэдуру гемадыялізу. Потым — доўгі шлях рэабілітацыі пасля аперацыі, строгія дыеты, таблеткі па 50 і болей за дзень. Дадаць сюды пастаянныя паездкі ў Брэст і Мінск да дактароў. Давялося на некаторы час пакінуць работу, бо сыну быў патрэбен пастаянны догляд. Як гэта ўсё перажыла, асіліла, цяпер Алене Клімовіч нават растлумачыць цяжка. Проста рабіла ўсё, што трэба.

Аднойчы муж сяброўкі, калі чарговы раз падвозіў іх з сынам у бальніцу, сказаў ёй: «Ты моцная жанчына, Алена, і вартая павагі». А яна адказала, што моцнай яе зрабілі гора, слёзы і безвыходнасць.

«Нікому не жадаю такой моцы. Хай лепей жанчына будзе слабай і будзе каму пра яе клапаціцца», — разважае Алена, і здрадніцкія слёзы, якія не зусім удаецца ўтаймаваць, выдаюць яе сапраўдную жаночую сутнасць. «Апошнім часам нейкая плаксівая стала», — нарэшце спраўляецца яна з сабой і дастае сямейны альбом.

На здымках яны з Валодзем маладыя і прыгожыя. Асабліва фатографу ўдаліся вясельныя партрэты, з якіх усміхаюцца 19-гадовая нявеста і не нашмат старэйшы жаніх. Яны былі прыгожай парай і мелі намер будаваць сваё шчаслівае жыццё. Але лёс выпрабоўваў іх сям'ю з самага пачатку. Пасля нараджэння першынца ў Алены адняліся ногі. Яна амаль што не магла перасоўвацца самастойна. Муж узяў на сябе асноўную частку работы па дому. Медыкі яе абнадзейвалі, парушаныя нервовыя канчаткі ўрэшце павінны былі прыйсці ў норму. Але час ішоў, лепей не станавілася. Тады маладой маці падказалі, што трэба нарадзіць зноў, маўляў, бывалі выпадкі. І праўда, пасля другіх родаў нібы само сабой усё стала на месца. Літаральна праз гадзіну-другую Алена змагла стаць на ногі. Гэта была іх першая сямейная перамога.

**У Алены чацвёртая група крыві з дадатным рэзусам, у сына — трэцяя з адмоўным. Дактары папярэджвалі, што нырка можа не прыжыцца...**

### Прысніла мужа ва ўсім белым

Здавалася б, жыццё павярнулася светлым бокам. Маладой сям'і з дваімі дзеткамі сельгаспрадпрыемства, дзе працаваў Уладзімір, выдзеліла дом. Хай не новы, але і тое было за шчасце. Клімовічы пачалі яго дабудоўваць, добраўпарадкоўваць. Усю работу па дому гаспадар у асноўным рабіў сваімі рукамі.

— Вось гэту кухню з памяшканнем, дзе цяпер калідор і санвузел, — паказвае гаспадыня, — Валодзя дабудаваў сам. Цяжка было, грошай вечна не хапала, але мы асабліва не засмучаліся, не кідаліся ў роспач. Памятаю, самая будоўля ў нас была. У адзін з дзён да дзяцей забеглі аднакласнікі старэйшага, клікалі іх на свята пасёлка. Ну і мае хлопцы, вядома, захацелі, папрасілі даць ім грошай на ваду, марожанае. Я адкрыла кашалёк: там ляжалі апошнія шэсць тысяч рублёў. Пра забаўлянкі гаворка адпала сама сабой. Па тых цэнах мы купілі на іх палову бохана хлеба, пачак цыгарэт для мужа і паўмяха цэменту. Назаўтра была зарплата, так што названы расклад здаўся зусім не страшным. І хлопцы мае не пакрыўдзіліся — не пайшлі і не пайшлі, затое нам дапамагалі. Так у сям'і было прынята.

Клімовічы трымалі тады падсобную гаспадарку, свінні і куры былі свае. Вялікі агарод забяспечваў патрэбы сям'і ў вітамінах. Жылі, як усе: працавалі, гадавалі дзяцей. Адзінае, што заўсёды непакоіла бацькоў, — здароўе малодшага сына Сашы. Ён з самага дзяцінства рос хваравітым. Нават у школу не хадзіў, быў на надомным навучанні. З гадамі да іншых праблем дабавілася сур'ёзная паталогія ныракаў...

А прыкладна пяць гадоў таму Уладзімір пачаў скардзіцца на галаўны боль. Сталічныя медыкі дыягнаставалі пухліну галаўнога мозга з метастазамі. Аперыраваць было позна. Яму толькі правялі курс хіміятэрапіі. Алена забрала мужа дадому, апошні месяц ён правёў у сваёй хаце. І адышоў, можна сказаць, у яе на руках.

Такім чынам жыццё раздзялілася на «да» і «пасля». Пасля яго адыходу яна стала галавой сям'і, ёй давялося прымаць рашэнні самой і несці за іх адказнасць.

Як і з гэтай перасадкай. На першы погляд усё проста: прыняла рашэнне — і пайшлі на аперацыю. Насамрэч усё вельмі складана. З аднаго боку, калі толькі з'явіўся шанц, яна адразу сказала: будзем аперыравацца. А з другога — яе адгаворвалі сваякі і знаёмыя. Ніхто не даваў ніякай гарантыі. У яе чацвёртая група крыві з дадатным рэзусам, у яго — трэцяя з адмоўным. Пры такім раскладзе рызыка ўзрастае шматразова. Цяпер нават смяецца, калі ўспамінае, што наіўна прапаноўвала «абмен» — аддаць пацыенту са сваёй групай крыві свой орган, а Сашы каб перасадзілі чужы з яго групай. Ёй растлумачылі, што рабіць так не дазваляе закон. Дактары папярэджвалі, што нырка можа не прыжыцца, і тады яе давядзецца выдаліць.

Два з паловай гады прайшло, а Алена памятае кожны з пражытых у тую пару дзён амаль з храналагічнай дакладнасцю. Перасадка была зроблена 23 красавіка 2013 года. Ёй аперацыю правялі даволі хутка, сыну рабілі доўга. І гэтыя гадзіны, калі яна ўжо адышла ад наркозу, усведамляла, што вось цяпер усё вырашаецца, былі, відаць, самымі цяжкімі. Але бясконцыя гадзіны прайшлі, да яе нарэшце зазірнуў доктар і сказаў, што нырка ў арганізме яе сына запрацавала... Тады яна зноў стала ўспамінаць мужа, згадваць убачаны напярэдадні сон, калі прысніла яго ва ўсім белым. Мусіць, гэта быў знак.

### «Ціха радуюся, каб не спужаць тую радасць»

Маці і сын вельмі ўдзячныя дактарам, ды і ўсяму персаналу Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак пры 9-й клінічнай бальніцы. Алена Мікалаеўна лічыць, што пацыентам дапамагаюць не толькі тэхналогіі, прэпараты, самі аперацыі, але і добразычлівасць, чалавечая спагада. У апошнім асаблівую патрэбу маюць людзі, для якіх трансплантацыя становіцца апошнім шанцам на жыццё. Нездарма ж потым у сваёй царкве яна заказала малебен за здароўе ўсіх медыкаў брыгады, якая рабіла аперацыі. Святар падказаў, ён жа блаславіў іх яшчэ перад аперацыяй. І цяпер дапамагае словам парады і суцяшэння: бацюшка зусім не рэдкі госць у гэтай сям'і.

І па радаснай нагодзе таксама. Ну, напрыклад, калі трэба пахрысціць унукаў. Цяпер Алена ведае: кожнаму Бог дае і свае выпрабаванні, і свае радасці. Радасцю апошніх гадоў, яе галоўным суцяшэннем стала з'яўленне ўнукаў і нявесткі Вольгі, якую Алена лічыць вельмі блізкім чалавекам. «Дачкі ў мяне няма, а Волечка — працавітая, энергічная, жыццярадасная — стала мне сапраўды як дачка».

Старэйшы сын Міхаіл працуе ў мясцовым сельгаспрадпрыемстве. Сюды па размеркаванні пасля тэхнікума прыехала дзяўчына родам са Столінскага раёна. Амаль адразу пасля яе прыезду Аленін сын стаў бегаць на спатканні, потым прадставіў маці Вольгу як сваю нявесту. Згулялі вяселле. І за чатыры гады Вольга паспела нарадзіць траіх дзяцей ды скончыць завочна ўніверсітэт. «Яна хуткая, што той метэор, усё бягом, усё ў яе ў руках гарыць», — ганарыцца нявесткай Алена Мікалаеўна. Жывуць маладыя праз два дамы.

А пра ўнукаў бабуля можа расказваць гадзінамі. Асабліва цікавы трохгадовы Антон. Ён старэйшы ў сям'і, ужо ходзіць у дзіцячы садок, шмат што ведае і ўмее, асабліва ў параўнанні з малечай. Насця, якой крыху менш за два гады, яўна паказвае схільнасць да мастацтва.

**Пасля нараджэння першынца ў Алены адняліся ногі. Тады маладой маці падказалі, што трэба нарадзіць зноў, маўляў, бывалі выпадкі.**

Дома яна размалёўвае шпалеры на ўсе лады, абы толькі знайшла ручку ці аловак. Ну а меншы Жэнька пакуль яшчэ не ходзіць і не малюе. Самыя радасныя моманты для дзяцей, калі іх тата дома. Як і ўсякі калгасны механізатар, Міхаіл з вясны да восені часта ідзе на працу, калі дзеці яшчэ спяць, і вяртаецца, калі яны ўжо спяць. А вось калі выпадае жаданы выхадны ці з-за дажджу здараецца вымушаны прастой, тады малыя атрымліваюць належнае. Алена Мікалаеўна расказвае: «Заходжу — сын ляжыць на падлозе, а дзеці поўзаюць па ім, коўзаюцца, меншы скача, нібы на батуце. Наша шматдзетная маці завіхаецца каля пліты. Гляджу на іх і ціха радуюся, каб не спужаць тую радасць», — гаворыць яна.

Але і гэтай сям'і лёс пасылае свае выпрабаванні. Крыху больш за месяц таму на працы Міхаіл атрымаў сур'ёзную траўму рукі. Яшчэ і цяпер ён знаходзіцца на лячэнні ў Пружанскай райбальніцы, рыхтуецца да другой аперацыі. Урачы даюць добры прагноз: палец, які пакуль што амаль нерухомы, павінен пачаць нармальна функцыянаваць. А маці зноў моліцца за сына, а таксама за здароўе медыкаў, якія яму дапамагаюць. «Хто б што ні гаварыў пра медыцыну, а я, як апошнія гады з гэтых устаноў не вылажу, то скажу, што бачыла столькі дабра, спагады, разумення! Мне наогул часта шанцуе на добрых людзей...»

### «Усё ў нас будзе добра»

Нягледзячы на ўсё, што давялося прайсці, Алена застаецца аптыміскай. «Усё ў нас будзе добра», — паўтарае яна, нібы мантру, і тым самым задае пэўную праграму дзецям і ўсёй сваёй сям'і. Да таго ж маці — тут прыклад неверагоднай працавітасці і энергіі, хоць і ў самой здароўе, мякка кажучы, пакідае жадаць лепшага. Алена Клімовіч працуе на Ружанскай мэблевай фабрыцы. Жывуць яны з сынам на яе сціплую зарплату і яго дапамогу па інваліднасці. Яна садзіць вялікі агарод, які забяспечвае сям'ю і свежай агароднінай, і нарыхтоўкамі на зіму. Маці навучылася так кансерваваць агуркі, што іх можна есці нават Сашу. У яе мноства кветак і ў дварыя (цяпер кусты руж клапатліва захутаны пакетамі), і ў доме. У вялікім пакоі расліны ў вазонах ствараюць амаль што летні сад.

А нядаўна ў дом правялі газ. Для гэтага Алене давялося ўзяць крэдыт. Але справа таго вартая, якасць жыцця ўзнялася на адчувальную прыступку. Яна ўвесь час нешта паляпшае ў хаце і вакол. Ну, напрыклад, вуліца Чкалава, дзе стаіць іх дом, апошнім часам стала зусім разбітай. Маці папрасіла сына прывезці прычэп камення, якое збіраюць з палёў. Міша прывёз. І, можна сказаць, сама вымасціла дарогу насупраць дома. Лепей зрабіць для сябе, чым невядома колькі чакаць, хадзіць па гразі і па ямах, баючыся за свой абутак, лічыць Алена. Перажыўшы столькі, сорамна засмучацца з-за дробязяў, кажа яна сама сабе, усміхаецца ды бяжыць далей па бясконцых справах: «Усё ў нас будзе добра».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*Пружанскі раён.*

# ПЕРШАЕ СЯБРОЎСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Улетку Акім амаль 2 месяцы не хадзіў у садок, і Даня вельмі сумаваў, усё пытаўся, чаму той не прыходзіць, і кожны дзень увечары засмучана нам паведамляў, што «пажарнага» зноў не было. Я назірала за сынам, і з аднаго боку, радавалася, што ён можа так сябраваць, з другога — хвалявалася, а ці «гарыць» той Акім з такім жа запалам сябраваць з Данем, ці не навязваецца сын?

Пасля лета раптам выявілася, што Даня і Акім больш не будуць хадзіць у адну групу, іх раздзялілі. У апошні дзень перад размеркаваннем муж крыху спазніўся і прыйшоў па сына, калі ўжо нікога з дзяцей не было, акрамя Акіма з маці (яна працавала выхавальніцай у нашай групе). Маці тлумачыла Акіму і Дані, што заўтра іх развядуць па розных групах. Дзеці стаялі, панурыўшы галовы, відаць, усё разумелі. «Але ж будзеце сустракацца на пляцоўцы», — спрабавала падбадзёрыць выхавальніца. Даня ўбачыў, што па яго прыйшоў тата, і развітаўся з Акімам. Той пайшоў з маці ў іншы бок. Але праз пару крокаў ён нечакана павярнуўся і, паклікаўшы Даню, кінуўся да яго, абняў і сказаў: «Я цябе люблю». У мужа ад расчуленасці нават слёзы на вочы навярнуліся.

**Праз пару крокаў ён нечакана павярнуўся і, паклікаўшы Даню, кінуўся да яго, абняў і сказаў: «Я цябе люблю». У мужа ад расчуленасці нават слёзы на вочы навярнуліся.**

Вось ужо другі месяц Даня ходзіць у іншую групу і кажа, што з Акімам яму сустрэцца на пляцоўцы не ўдаецца. Зноў і зноў просіць, каб мы перавялі яго ў групу да сябра-«пажарнага». Але гэта лагапедычная група, і трапіць туды можна толькі па накіраванні. У сваю чаргу мы абяцаем сыну і зробім усё магчымае, каб гэтыя абяцанні выканаць. Дарэчы скажу, што накіраванне ў лагапедычную групу мы ўжо атрымалі.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

## У БАЦЬКОЎСКІ НАТАТНІК

1. Заўсёды цікаўцеся сябрамі свайго дзіцяці, пытайцеся ў яго, з кім ён гуляў сёння, якія захапленні ёсць у яго сяброў.

2. Як сцвярджаюць псіхолагі, найлепшая пазіцыя дарослых у дружбе дзяцей — не ўмешвацца. Але быць побач, калі дзіця можа не зразумець асаблівасцяў сітуацыі або яму спатрэбіцца падтрымка. Самая вялікая памылка — прымушаць дзіця да шматлікіх сяброўскіх стасункаў. Жаданне бацькоў, каб сын ці дачка былі папулярныя сярод аднагодкаў, зразумелае, але яно можа не супадаць з жаданнем дзіцяці.

3. Даказана, што дзеці вучацца сябраваць на прыкладзе бацькоў. Яны бачаць, як маці ці бацька ставяцца да сяброўства, ці шануюць сяброў. Самыя маленькія назіраюць, як маці паводзіць сябе з іншымі мамамі на дзіцячай пляцоўцы. Аднак нельга прымушаць свайго сына ці дачку сябраваць з дзіцем, калі з яго маці ў вас сяброўскія стасункі. Паважайце выбар малечы.

4. Існуюць вельмі сарамлівыя дзеці, асабліва ў дашкольным узросце. Такім цяжка зрабіць крок насустрач патэнцыяльнаму сябру. Таму маці можа крышачку падштурхнуць малога. Падказаць, што спачатку трэба падыйсці да незнаёмага хлопчыка ці дзяўчынкі, запытаць імя, потым прапанаваць, напрыклад, пагуляць разам. Пастарайцеся дома праводзіць з дзіцем як мага больш часу, заўсёды паказвайце яму, што вы цікавіцеся яго думкай, цэніце яго ідэі. Трэба насцярожыцца, калі малое часта аддае свае цацкі некаму, спадзеючыся з ім такім чынам пасябраваць. Такі «подкуп» можа сведчыць аб дзіцячай няўпэўненасці і, як вынік, заніжанай самаацэнцы. Навучыце малое цікава праводзіць час, калі яно застаецца адно. Гэта дабавіць яму смеласці і рашучасці.

Частыя сваркі не з адным, а са многімі сябрамі таксама могуць быць сігналам схаваных дзіцячых праблем. Абавязкова разбярыцеся, у чым прычына такой «няўжыўчывасці».

5. Пры пераездзе на новае месца жыхарства, змене школы ці садка ў далейшых зносінах дзіцяці могуць з'явіцца цяжкасці. Таму падрыхтуйце яго загадзя да хуткіх перамен.

6. Асаблівая сітуацыя, калі вашаму сыну ці дачцэ здрадзіў сябар або пачаў пазбягаць зносін. Зразумела, трэба разабрацца, у чым справа. Прапануйце малому самому растлумачыць, чаму так адбылося. Паразважайце разам, якім павінен быць сапраўдны сябар. Ні ў якім разе нельга лаяць былога таварыша (можа здарыцца, што яны потым памірацца). Таксама нельга высвятляць адносіны з бацькамі сябра. Найлепшае выйсце — адцягнуць увагу, зацікавіць дзіця нечым новым, адвесці ў гурток або запісаць у спартыўную секцыю. Мабыць, у хуткім часе там яно знойдзе новых сяброў!

7. Бывае так, што бацькам не падабаецца сябар іх дзіцяці. Што рабіць? Не перашкаджайце зносінам катэгарычна. Наадварот, можна запрасіць сябра дадому. Галоўнае — гэта захаваць ваш кантакт з малым. Магчыма, калі ў яго з'явяцца іншыя захапленні, ён сам паступова аддаліцца ад непажаданага дружбака.

Але ж калі сяброўства пагражае жыццю дзіцяці ці ператвараецца ў сапраўдную залежнасць, трэба дзейнічаць неадкладна. Растлумачце, што вы хвалюецеся за дзіця і для вас яго бяспека больш важная, чым тое, што ён пакрыўдзіцца з-за забароны сябраваць.

Стаўленне да дружбы мяняецца з цягам часу. Для дашкалятаў сябры — гэта ўсе, з кім яны гуляюць. Пасля 10 гадоў дзеці звычайна пачынаюць шукаць сваё кола зносін. Яно грунтуецца на ўзаемным даверы, агульных захапленнях, аднолькавых поглядах. У падлеткаў сяброўскія зносіны ўсё больш нагадваюць дарослыя. Да таго ж для іх яны больш значныя, чым нават стасункі з бацькамі. Хлопчыкі пачынаюць сябраваць з дзяўчаткамі, з-за чаго могуць узнікнуць спрэчкі з таварышамі. Добра, калі бацькі растлумачаць дзіцяці неабходнасць абедзвюх формаў стасункаў (і з сябрам, і з каханай), нагадаюць аб сяброўскай вернасці, аб праве быць з любімым чалавекам і неабходнасці паважаць пачуцці іншага.

У любым выпадку дапамажыце дзіцяці знайсці і захаваць дружбу. Бо менавіта сябры з маленства застаюцца самымі надзейнымі ў дарослым жыцці. А ўменне сябраваць — гэта яскравы прыклад сапраўднай чалавечнасці і вернасці.

## ■ Парады псіхолага

**На пытанні чытачоў адказвае Кацярына ШАВЯЛЁВА, перынатальны псіхолаг, кансультант па родах, магістр сацыяльных навук, аўтар шматлікіх артыкулаў па псіхалогіі, маці траіх дзяцей.**

### КАЛІ СЫН ГІПЕРАКТЫЎНЫ

*У мяне трое дзетак. Старэйшай дачцэ 28 гадоў, сыну 17 і малодшы, Фёдар, скончыў першы клас. Вось якраз з ім шмат праблем. Ён гіперактыўны, мае столькі энергіі, што можа бегаць няспынна хоць цэлы дзень, зусім не слухаецца мяне, толькі часам тату. Наколькі гэта небяспечна? Як з гэтым змагацца без таблетак і дактароў? Увогуле, ці магчыма гэта?*

**Алена, 47 гадоў, Мінск.**

Па-першае, магчыма, што гіперактыўнасць звязана з адаптацыяй да школы. У любога дзіцяці пры паступленні ў першы клас павышаецца нервовая псіхічная стомленасць. У 2-м і 3-м узбуджальнасць праяўляецца яшчэ больш відавочна. І гэта характэрна для любога дзіцяці. Таму што заняткі ў школе нават у самага здаровага забіраюць шмат сіл і ўздзейнічаюць на псіхіку.

Па-другое, гіперактыўнасць можа быць хваробай. Але вельмі часта гіперактыўнымі называюць непасед. Маме трэба дакладна разумець, што гэта: неўралагічны дыягназ ці звычайная дзіцячая актыўнасць. Калі першы выпадак, то сімптомы наступныя: парушэнне канцэнтрацыі ўвагі, павышаная рухавая актыўнасць, рассеянасць, агрэсіўнасць. Псуецца мелкая маторыка рук. Гэта адбіваецца на почырку. Дзіцяці складана самастойна апранацца, зашпільваць гузікі, завязваць матузкі. Ён часта б'ецца, падае, бо рухаў шмат, але яны надта хаатычныя. Гіперактыўнае дзіця не можа і дзвюх хвілін пасядзець на адным месцы. Але такі дыягназ павінен паставіць неўролаг.

Калі ўсё ж такі гаворка ідзе пра звычайную актыўнасць, то лепшыя лекі — строгі рэжым. Ён увогуле неабходны кожнаму дзіцяці — своеасаблівыя абмежавальныя рамкі. Тады яму становіцца лягчэй. Бывае, што такога непаседу складана пакласці спаць. Трэба стварыць нейкі спакойны рытуал: масаж, чытанне кнігі ці проста пасядзець побач. На працягу дня лепш мінімізаваць прагляд тэлевізара і гульню на камп'ютары, бо яны ўзбуджаюць малога. Бывае, што з надта актыўнымі дзецьмі складана размаўляць. Для таго каб гэта паправіць, трэба, каб маці адшукала хаця б адну вольную гадзіну ў дзень і выслухала сына ці дачку. Што да спорту, то тут трэба абраць спакойныя, расслабляльныя віды, такія як плаванне. Барацьбой лепш не займацца, бо спаборніцкі элемент зноў-такі можа выклікаць агрэсію.

### ЗАХАВАЦЬ АДНОСІНЫ ЦІ ЛЕЦІШЧА?

*Маёй маці 73. За апошні год нашы адносіны зусім сапсаваліся. Яна ўсім незадаволеная, пастаянна крычыць па дробязях, дасылае праклёны ў мой адрас. Наш камень сутыкнення — лецішча, на якім ёй нібыта няма месца. Хаця яна прыязджае і робіць там, што хоча. А мы толькі распачалі ў доме перабудову, якой яна, зразумела ж, незадаволеная... Падкажыце, што рабіць у такой сітуацыі?*

**Іна, 47 гадоў, Мінск.**

Для таго каб дакладна адказаць на гэтае пытанне, нам невядома даволі шмат акалічнасцяў. І адна — ваша разуменне, што хочаце захаваць: адносіны ці лецішча? Таму застаецца толькі здагадвацца і прывесці некалькі магчымых варыянтаў. Нам невядома, што здарылася паміж вамі і маці год таму. Магчыма, праблема хаваецца ў гэтым. Калі стасункі зусім дрэнныя, а мама ездзіць на лецішча — значыць, яна на нагах, сябе можа абслугоўваць, — і трэба проста раз'ехацца. То бок вырашыць гэтую псіхалагічную сітуацыю элементарным фізічным раздзяленнем. Калі ёсць жаданне менавіта паправіць адносіны, то трэба разумець, што ў 73 гады чалавек наўрад ці зможа штосьці радыкальна ў сабе змяніць. Бо з узростам складаней адаптавацца да новых абставін і ўмоў. Таму дачка павінна імкнуцца быць больш паблажлівай і падстройвацца пад маці.

**Калі ў вашай сям'і ўзнікла складаная сітуацыя і вы не можаце разабрацца самастойна — спытайце парады ў спецыяліста. Пытанні дасылайце на электронную пошту pustavit@zviazda.by ці на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, «Звязда»**

## ■ Вазьму твой боль...

# ЖЫЦЬ БЕЗ СЭНСУ — ВОСЬ У ЧЫМ СЭНС

**Мы ўсе шукаем сэнс жыцця. Агульны, экзістэнцыйны сэнс — і прыватны, свой, асабісты. Мы так захапляемся філасофскай думкай пра мэту, што гатовы пакласці ўсё жыццё на яе пошук. Атрымліваецца, што сэнс жыцця ў пошуку жыццёвага сэнсу? Бессэнсоўна.**

Я выканаўца, старанны выканаўца са схільнасцю да перфекцыянізму. Усё зраблю — толькі ясна пастаўце задачу. І не заікайцеся пра канчатковую мэту. Гэта ўсё разбурае.

Складаючы план дня, я кожны раз пісала ў нататніку «выратаваць свет». Лічыла, што гэта мой сэнс. І ведаць не ведала, як яго ажыццявіць. А потым аднойчы закрэсліла амбіцыйную фармулёўку і зверху напісала «саступіць месца ў транспарце», назаўтра ў гэтым жа пункце — «падняць настрой сумнаму незнаёмцу», на паслязаўтра — «падзякаваць дворніку за работу». Так я ішла да мэты, разбіваючы шлях на маленькія задачы. І так ратавала свет.

Калі я пастаўлю сабе мэту быць шчаслівай, то саб'юся ў самым пачатку. Стану баяцца, хвалявацца, сумнявацца, вяртацца, збочваць. Перастану верыць і апушчу рукі.

Лепш пастаўлю некалькі задач, больш рэальных, блізкіх і зразумелых. Скажам, утульны дом, сытны абед, любімая праца, задаволены муж і дзеці за гульнёй. Сапраўднае шчасце. І пачну пакрокава выконваць. Што там першым пунктам? Утульны дом? Засцілаю ложкі, бяруся за пыласос, паліваю кветкі, вешаю новую карціну. Утульна. Наступная задача?..

Увесь час мне не дае спакою думка пра ролю, місію, прызначэнне. Для чаго я на Зямлі? У чым сэнс? Што рабіць? Як служыць? Чым апраўдаць сваё існаванне? Я шукаю мэту паўсюль, збіваю ногі, блытаю дарогі.

Расчараваўшыся ў пошуках і страціўшы надзею, бяруся за наступную прыземленую задачу. На чарзе сытны абед. Ну што ж, згатую яго! Падкасваю рукавы, увіхаюся ля пліты — вуаля, вось вам першая страва, другая і кампот. А пасля дэсерту сапраўды на душы весялей...

Дык што я там шукала? Сэнс жыцця? Быць шчаслівай... А як гэта? Што ёсць шчасце? Не памыліцца б! І зноў шукаю не там, растрачваюся не на тое, іду не туды. За наступным паваротам таксама не хаваецца сэнс жыцця. Ён увогуле існуе?

Не. Не існуе. Так сцвярджае прафесар, доктар медыцыны Ірвін Ялом. Ён лічыць, што нашы псіхалагічныя праблемы ў асноўным звязаныя з няведаннем ці непрыняццем чатырох дадзеных ісцін: непазбежнасці смерці, уласнай свабоды тварыць сваё жыццё, унутранай адзіноты кожнага і, нарэшце, адсутнасці відавочнага сэнсу жыцця. Яно, жыццё, проста ёсць. І яго сэнс у тым, каб пражываць. Не шукаць і адчайвацца. А жыць без сэнсу. Вось у чым сэнс!

Гэтая ідэя ідэальна ўклалася ў мае экзістэнцыйныя пошукі. Я вольная! Вольная ад абавязкаў і мэт! Я вольная проста жыць!

І ўся мая філасофія, напрацаваны светапогляд і нажыты досвед таксама гладка ляглі на ідэю бессэнсоўнасці, радасна заківалі галовамі і імгненна пагадзіліся проста жыць, жыць без сэнсу.

Шукаць мэту існавання — значыць зазірнуць у планы Бога, дапытвацца пра Яго задумы. Спрабаваць кантраляваць сваё жыццё — значыць не давяраць Богу, спрачацца. А ў Яго ўсё прадумана без нас. Яшчэ да нараджэння мы маем ролю, функцыю (добра-добра, мэту, калі вам так зручней) у агульным арганізме Сусвету. Я магу ўсё жыццё маркотна закручваць гайкі, скардзіцца на бязглуздасць і нікчэмнасць свайго лёсу і нават не здагадвацца, як важна гэта для цэлага арганізма.

Мы жывём у сістэме. І работа кожнай дэталі адладжана. Кожная функцыя важная, бо яна дапаўняе астатнія, бо без яе не працуюць іншыя. Мы мануфактура. І калі гаечнік вырашае рэалізавацца, кідае сваю манатонную справу і шукае сэнс жыцця, пакутуе цэлы арганізм, уся мануфактура. Бо закручванне гаек, уявіце сабе, можа быць сэнсам жыцця!

Я перастала шукаць мэту і тым самым знайшла яе. Жыць без сэнсу і рабіць тое, што прыносіць задавальненне.

Дапісваю калонку, і задачу нумар тры — любімая работа — на сёння выканала. Пайду абдыму мужа і пагуляю ў цацкі з сынам. Так проста ператварыць формулу ў жыццё. Жыццё, якое не мае сэнсу.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000».**

## Галіна СКРЫГАН:

# «ТАТА ЎСЁ РАСКАЗАЎ МАМЕ, АКРАМЯ ТАГО, ШТО ЁН БЕЛАРУСКІ ПІСЬМЕННІК»

**Ва ўтульнай кватэры Галіны Іванаўны адразу кідаецца ў вочы вялікая колькасць кніг і фотаздымкаў. Гэта тое, што шчыльна звязвае жанчыну з памяццю пра бацьку — выдатнага беларускага пісьменніка, нарысіста, крытыка Яна Скрыгана. Ён — адзін з тых, хто, нягледзячы на шматлікія выпрабаванні лёсу, здолеў застацца не толькі творцам, але і чалавекам. Напярэдадні 110-гадовага юбілею з дня нараджэння Яна Аляксеевіча мы завіталі ў госці да яго дачкі.**

Пра перыпетыі жыцця цяпер нагадваюць хіба што старыя сямейныя фота.

### Саюз пісьменнікаў на «Валадарцы»

Сваю творчасць Ян Скрыган пачаў у 19-гадовым узросце, калі з родных Труханавіч, што ў Капыльскім раёне, пераехаў у Слуцк. Як у простым вясковым хлапчуку абудзілася цяга да літаратуры?

— У бацькоў не было вялікай адукацыі, але ж нейкая пачатковая была. І татаў бацька вельмі любіў чытаць. Таму і мой тата да гэтага цягнуўся, — распавядае Галіна Іванаўна. — Ён недзе знайшоў кнігу Янкі Купалы і чытаў яе бацьку. На што той казаў: «Якія словы! Ну-ка, яшчэ раз прачытай!»

У Слуцку Ян пазнаёміўся з Паўлюком Шукайлам і іншымі пісьменнікамі-пачаткоўцамі. Жыццё было вельмі цікавае і насычанае, напоўненае марамі аб лепшай будучыні, эксперыментамі ў розных літаратурных плынях. Галіна Іванаўна ўспамінае з аповедаў бацькі, што маладыя пісьменнікі збіраліся ў кагосьці дома, рассцілалі на падлозе кажухі, клаліся на іх і пачыналі размаўляць, дзяліцца ідэямі, спрачацца...

Неўзабаве Яна накіравалі ў Полацк, і ў Расонах ён пазнаёміўся з Петрусём Броўкам. Галіна Іванаўна паказвае мне цікавы фотаздымак з тых часоў, які цяпер можна ўбачыць у музеі Броўкі. На ім маладыя пісьменнікі ў капелюшах.

— Ім па 19 гадоў, яны з Броўкам купілі тыя капелюшы і сфатаграфаваліся ў іх, бо тады гэта лічылася шыкам, — усміхаецца дачка пісьменніка.

Такое разняволенае жыццё працягвалася да 1936 года. Да гэтага часу Ян Скрыган ажаніўся, і жонка Галіна ўжо чакала дзіця. Аднойчы, калі пісьменнік знаходзіўся ў Доме творчасці пад Пухавічамі, яна збіралася наведаць яго. Напярэдадні ўвечары Скрыган падрыхтаваўся да сустрэчы, набыў у краме ласункаў... А ўначы да яго пагрукаліся: «Збірайцеся!»

— Цвярозым розумам тое, што тады адбывалася, не зразумець. Таталітарная сістэма была адрэгуляваная, «бралі» ўсіх запар. Мала таго, што чорныя «варанкі» прыязджалі па людзей ноччу, каб не было відаць, дык яшчэ ездзілі і машыны з надпісам «Хлеб», у якіх таксама вазілі людзей... Сяргей Грахоўскі (беларускі пісьменнік і перакладчык, прайшоў сталінскія лагеры. — **Аўт.**) пасля казаў, што на «Валадарцы» можна было адкрываць аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР, — распавядае Галіна Скрыган.

Нейкі час пісьменнік правёў у турме на вуліцы Валадарскага ў Мінску. Асудзілі яго па сумнавядомым 58-м артыкуле за «контррэвалюцыйную дзейнасць». Перад транспартаваннем у Сібір, калі на вакзале вязняў запіхвалі ў вагоны, на некалькі секундаў зрок выхапіў родны твар жонкі, якая стаяла з маленькім скруткам у руках — нованароджаным сынам... Невядома, якім чынам жанчыны даведаліся, дзе і калі будуць этапаваць іх мужоў, і прыйшлі, каб паглядзець на іх. Гэта была апошняя сустрэча Яна Скрыгана з Галінай.

### Пальцам у... карту

Атрымаўшы 10 гадоў лагераў без права перапіскі, Ян Скрыган апынуўся ў Кемераўскай вобласці. Калі пачалася вайна, ён шмат разоў пісаў заявы з просьбай, каб яго адправілі на фронт. Добра разумеў, што з «зэкаў» фарміравалі «першую калону», трапіць у якую азначала верную смерць. Але гэта яго не спыняла.

І раптам — выпадак. У лагеры не хапала бухгалтараў. І аднойчы ў вязняў запыталіся, хто ўмее лічыць на лічыльніках. Пісьменнік падумаў пра сябе: «Няўжо я не змагу лічыць на лічыльніках?» І падняў руку. Так ён стаў працаваць бухгалтарам. Іван Аляксеевіч не толькі змог самастойна асвоіць новую спецыяльнасць, але і добра спраўляўся са сваімі абавязкамі.

У 1941 годзе невядома як да Скрыгана дайшлі звесткі, што ў дом на Круглай плошчы ў Мінску, дзе жылі яго жонка і сын, трапіла бомба і ўсе загінулі...

— Ён чалавек вельмі моцны і ніколі не ўпадае ў дэпрэсію, — гаворыць Галіна Іванаўна, якая пра бацьку кажа толькі ў цяперашнім часе. — Заўсёды падумае, заўсёды лічыць, што выйсце ёсць. Вось ён і трымаўся.

Ян Скрыган. Няскораны рамантык з жалезнай воляй.

Калі нарэшце ссылка скончылася, пісьменнік выйшаў на волю, аднак ніякай рэабілітацыі не было. Куды ён мог пайсці з такім кляймом, дзе мог пачаць жыццё з пачатку? Гэтае пытанне ён прама задаў чалавеку, які выпісваў яму дакументы аб вызваленні. Той не разгубіўся, загадаў Скрыгану заплюшчыць вочы і тыркнуць пальцам у карту Савецкага Саюза, якая вісела на сцяне. Так і зрабілі. Калі пісьменнік расплюшчыў вочы, яго палец паказваў на Фергану ва Узбекскай ССР.

**Ян падрыхтаваўся да сустрэчы з жонкай, набыў у краме ласункаў... А ўначы да яго пагрукаліся: «Збірайцеся!»**

І ён пайшоў туды. Без грошай, прадуктаў, прасіў падвезці тых, каму было па дарозе, калоў дровы ў жыхароў вёсак, якія за гэта давалі яму ежу, губляў прытомнасць падчас шляху. Нарэшце дабраўся да Ферганы і ўладкаваўся на эвакуяваны з Масквы гідролізны завод, які месціўся на ўскрайку горада.

— У сваіх успамінах тата часта піша, што ў жыцці яму трапляліся розныя людзі — і добрыя, і кепскія. Але добрых было больш, — кажа Галіна Скрыган.

Былы зняволены адразу з дарогі, у чым быў, пайшоў у кабінет дырэктара завода. І сказаў, што шукае працу бухгалтара. Той адказаў, што сапраўды бухгалтар патрэбен. «Але ж вы бачыце, у якім я выглядзе...» — прамармытаў падарожнік. «Я ўсё бачу, — адказаў дырэктар. — Ідзіце афармляйцеся».

### «Дзядзя Ян, ажаніцеся з маёй мамай»

Стаў працаваць, пасябраваў з інтэлігентнай масквічкай Ганнай, якая была на заводзе інжынерам. Яна пачалавечы шкадавала Яна і нават дзялілася з ім сваімі харчовымі картачкамі. Асабліва прывязаўся да беларуса дзесяцігадовы сын Ганны Алік. Аднойчы ён проста сказаў: «Дзядзя Ян, ажаніцеся з маёй мамай!» На што прастадушны Скрыган адказаў, што для гэтага трэба, каб мама хоць кропельку яго палюбіла. Доўга яшчэ малы чапляўся да маці з просьбай «хоць кропельку палюбіць дзядзю Яна»... У выніку ці то просьбы Аліка падзейнічалі, ці проста не магло быць іначай, але Ганна, у якой муж загінуў, стала жонкай Яна Скрыгана. Там жа, у Фергане, у 1948 годзе ў іх нарадзілася дачка Галя, якую на тамтэйшы манер усе звалі Гуленькай. Ганна з разуменнем паставілася да жадання мужа назваць дзяўчынку імем першай жонкі, а калі б нарадзіўся хлопчык — імем сына Усевалада. Ян усё расказаў Ганне, акрамя таго, што ён — беларускі пісьменнік.

Неяк прыйшоў ліст ад знаёмага з Эстоніі, з якім Ян быў у лагеры. Той паведамляў, што ім патрэбен бухгалтар на сланцахімічны камбінат. Не доўга думаючы, сям'я сабрала рэчы і пераехала з Ферганы ў Эстонію. Прадпрыемства, на якое запрасілі працаваць Скрыгана, фактычна стала банкрутам, галоўны бухгалтар уцёк, рабочыя не атрымлівалі зарплату па некалькі гадоў.

— Аднойчы, калі бацьку толькі-толькі ўдалося ўпарадкаваць бухгалтэрыю, да яго прыйшлі раз'юшаныя рабочыя з патрабаваннем заробку. І ён ім сказаў: «Таварышы, не хвалюйцеся, ідзіце спакойна спаць. Заўтра вы атрымаеце ўсе свае грошы». Ён так гэта сказаў, што ўсе заціхлі, і назаўтра людзі атрымалі грошы.

Сям'і выдзелілі дом, з'явіліся грошы, «зажылі як людзі», успамінае Галіна Іванаўна. Але аднойчы проста на працу да Яна Скрыгана прыйшлі двое ў цывільным.

— У 1949 годзе, калі ўжо больш-менш акрыялі ад вайны, выйшаў загад «зверху»: усіх, хто адседзеў 10 гадоў па 58-м артыкуле, трэба зноў саслаць, каб яны не «муцілі ваду». Баяліся, што людзі пачнуць помсціць.

Галіне ўжо было паўтара года, калі бацьку забралі другі раз. Перад ссылкай яму дазволілі зайсці дамоў пераапрануцца і развітацца з роднымі. «Добры трапіўся чалавек, які мяне канваіраваў!» — успамінаў пазней у дзённіках Скрыган.

Дзяўчынка засталася з маці, братам і цёткай. Ганна, жанчына з загартаваным характарам, паабяцала мужу прыехаць да яго. Але яна не ведала, што гэта адбудзецца так хутка. Адзін чалавек, які працаваў у міліцыі кіроўцам, падслухаў размову, што з жонкай Скрыгана таксама збіраюцца расправіцца, і папярэдзіў яе пра гэта. Ганна з сястрой узялі толькі дзяцей, пад выглядам прагулкі акольнымі шляхамі прыйшлі на вакзал і селі ў цягнік. Так яны дабраліся да сяла Сухабузімскага, што ў Краснаярскім краі, і сустрэліся з Янам.

— Якія там былі людзі! Да нас прыходзілі акадэмікі! Калі тата казаў: «Калі я быў у акадэміі...», гэта значыла ў ссылцы, — успамінае Галіна Іванаўна. З тых часоў са словам «акадэмія» ў яе зусім іншыя асацыяцыі, як і са словам «лагер».

### Узлёт пасля падзенняў

Скрыган працаваў бухгалтарам у калгасе. Спачатку сям'я жыла ў людзей, а праз нейкі час змагла купіць зямлянку. У 1953 годзе памёр Сталін, і, пачынаючы з 1954-га, савецкія рэпрэсаваныя пачалі пакідаць лагеры. Сям'я Скрыган прыехала ў Мінск, у 1955 годзе Галя пайшла ў першы клас. Яна Аляксеевіча рэабілітавалі, аднавілі ў правах. Ён актыўна ўключыўся ў літаратурную дзейнасць: працаваў рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР, літкансультантам Саюза пісьменнікаў, рэдактарам і намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя». Быў выдатным знаўцам і стылістам мовы, і Пятрусь Броўка, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская савецкая энцыклапедыя», запрасіў яго на пасаду загадчыка літаратурна-кантрольнай рэдакцыі. Узнагароджаны медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага савета БССР, Ганаровай граматай Вярхоўнага савета Тувінскай АССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за ўдзел у стварэнні дванаццацітомнай БелСЭ. Заслужаны работнік культуры Беларусі.

— Калі тату было 60 гадоў і трэба было афармляцца на пенсію, мама смяялася: «Янчык, якая прыгажосць: табе 60 гадоў, а стажу — 120». Таму што, калі адбылася рэабілітацыя і аднаўленне ў правах, за кошт ссылкі адзін год працы прыраўнавалі да трох, — тлумачыць Галіна Іванаўна.

Нават два лагерныя тэрміны і зламаныя жыцці блізкіх не загасілі ў пісьменніку любові да Радзімы. Па словах дачкі, ён усё жыццё заставаўся шчырым, дзесьці наіўным, усё рабіў з поўнай аддачай. І пры гэтым не захаваў ніякай крыўды на несправядлівасць лёсу.

**У 1941 годзе невядома як да Скрыгана дайшлі звесткі, што ў дом на Круглай плошчы ў Мінску, дзе жылі яго жонка і сын, трапіла бомба і ўсе загінулі...**

Галіна скончыла музычнае вучылішча і кансерваторыю. Вырасціўшы траіх дзяцей, прычакаўшы ўнукаў, яна прызнаецца, што нарэшце, з выхадам на пенсію, адчула сябе свабоднай, бо можа рабіць тое, што хоча. І робіць: Галіна Скрыган упарадкавала архівы і выдала некалькі кніг свайго бацькі, прэзентацыя апошняй з іх адбудзецца 18 лістапада.

...Яшчэ пры жыцці Яна Аляксеевіча, у 1963 годзе, сям'я атрымала ліст з Заходняй Германіі, у якім быў фотаздымак прыгожага маладога чалавека з надпісам: «Дарагому бацьку ад сына Усевалада». Аказалася, што першая жонка і дзіця пісьменніка не загінулі, іх вывезлі ў Германію, дзе яны і засталіся. З-за «жалезнай заслоны» бацька сына так і не ўбачыў. Затое Галіна Іванаўна паспела двойчы адведаць брата. Некалькі гадоў таму яго не стала...

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*
**Фота аўтара і з сямейнага архіва Галіны СКРЫГАН.**

Злева направа: Сцяпан Сямашка, Паўлюк Шукайла, Пятрусь Броўка, Янка Відук (Скрыган). Полацк, 1927 г.

# КАРЖОВА — ГЭТА НЕ ПСЕЎДАНІМ

## «ЗА НАС УСЁ ВЫРАШЫЛІ СЯБРЫ»

— Ніколі не ставіла перад сабой мэты стаць уладальніцай нейкага там тытула. Але гэта той выпадак, калі за нас усё вырашылі сябры, — усміхаецца Таццяна. — Яны адправілі на конкурс заяўку, і пра тое, што мы ўдзельнікі, стала вядома за месяц да мерапрыемства. Круціліся паміж Мінскам і Магілёвам, па 2-3 разы на тыдзень ездзілі ў сталіцу. Займаліся харэаграфіяй, праходзілі розныя майстар-класы. Калі б не водпуск, не ведаю, як бы ўсё паспелі.

На конкурс паступіла 200 заявак, але ў фінал прайшлі толькі 10 сем'яў. У тым ліку і Каржовы. На першы майстар-клас па кулінарыі Таццяна ездзіла разам з дачкой Машай. Нягледзячы на свой юны ўзрост, яна ўжо дапамагала маці ўпрыгожваць торт пацеркамі.

На спаборніцтвы ў Мінск Каржовы прыехалі з цэлай камандай падтрымкі. Сябры дапамагалі і з падрыхтоўкай, і на сцэне. Кожны нумар быў прадуманы да дробязяў. Таццяна з Максімам аказаліся добрымі вучнямі. Схоплівалі ўсё адразу. Дастаткова ўзгадаць тое ж танга. Для навічкоў, якія ўзялі перад конкурсам усяго некалькі ўрокаў танца, яны трымаліся зусім няблага. Можна было падумаць, што толькі гэтым усё жыццё і займаліся.

Ды і дачушкі ўсе ў бацькоў, таленавітыя і вынаходлівыя. Публіку насмяшыла, калі Маша вынесла на сцэну пакет мукі, «акунула» туды свой тварык і, выцягнуўшы напудраны белым пылком носік, гарэзліва, як у тым мульціку, чхнула.

## ДЗЯЎЧЫНА БЕЗ АДРАСА

Сама Таццяна родам з Валынскай вобласці, ва Украіне жыве яе шматлікая радня. У Беларусь прыехала следам за сёстрамі, калі ёй было 14 гадоў. З будучым мужам Максімам пазнаёмілася яшчэ ў 9 класе. Нават парты іх стаялі побач. Але тады яны яшчэ не ведалі, што будуць разам. Усё адбылося значна пазней.

— Я якраз заканчвала інстытут, — расказвае Таццяна. — Добра вучылася, займалася самадзейнасцю. Прыхільнікаў было шмат, але такога, каму б я «аддала» сваё сэрца, не хапала. Я перажывала той перыяд, калі хацелася знайсці сваю другую палову, стварыць сям'ю, стаць захавальніцай хатняга ачага. Верыла, што мае надзеі аднойчы спраўдзяцца. Раніцай чытала малітву аб замужжы. Цуд адбыўся 21 кастрычніка. Я ехала дамоў і не падазравала, што на прыпынку, дзе павінна была выйсці, мяне чакае сюрпрыз. Дзверы маршруткі расчыніліся, і перад маімі вачыма з'явіўся ЁН. Гэта быў мой былы аднакласнік, Максім. Прайшло 10 гадоў пасля нашай апошняй сустрэчы, але я добра памятала яго са школы. Ён стаяў, глядзеў на мяне і шырока ўсміхаўся. Падалося, што хлопец чакаў мяне, і я працягнула яму руку. Здавалася, я

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Перавернутыя тарты ў Беларусі робіць толькі Таццяна (крайняя справа). Сюрпрыз для маладых.

сплю і бачу чароўны сон. Нечакана пачаўся снег, я раскрыла парасон і мы стаялі пад ім, як зачараваныя, і глядзелі адно на аднаго. На зямлю вярнуў здзіўлены голас яго брата: «А што гэта за дзяўчына?» Было бачна, што Максім разгубіўся, не ведаў, што адказаць. Як потым высветлілася, ён вельмі туманна помніў мяне і нават не памятаў, як завуць. А на прыпынку апынуўся выпадкова і ўсміхаўся зусім не мне.

Хлопец быў ашаломлены, але хутка ўзяў сябе ў рукі і спытаўся, ці можна прыйсці да дзяўчыны ў госці. Звычайна такія спробы яна спыняла адразу, а тут пагадзілася: «Прыходзь у нядзелю». Вось толькі нумар інтэрната, дзе жыве, не паведаміла. Таксама разгубілася. Але ў нядзелю шарлотку ўсё ж такі спякла. І не дарэмна. Максім прыйшоў. Хаця давялося паблукаць, як таму герою з фільма «Дзяўчына без адраса». А вечарам яны пайшлі гуляць па горадзе і было адчуванне, што ніколі не разлучаліся. Вяселле доўга чакаць сябе не прымусіла.

Таццяна ўпэўнена, што сустрэцца ім дапамагла менавіта малітва. Да духоўнага жыцця яна далучылася дзякуючы сваёй бабулі Настассі. Для сваіх 8 сыноў і дачок, а потым і ўнукаў яна была прыкладам: спявала, ткала, гатавала — сапраўдная маці, цёплая, ласкавая. Калі маленькай Таццяне было ўсяго 3 гады, яна навучыла яе чытаць малітву «Ойча наш». У бабулінай хаце ў чырвоным куце вісела ікона Збавіцеля ў цярновым вянку. І маленькая Таня ні секунды не сумнявалася, што Бог існуе. Запомнілася таксама, як было весела ў бабулінай хаце, калі там збіраліся ўся яе шматлікая радня. Спявалі так, што здавалася — выступае прафесійны хор. Чым-чым, а талентамі сваякоў прырода не абдзяліла. Стрыечныя браты Таццяны — добрыя мастакі і скульптары, працуюць выкладчыкамі ў Львоўскай акадэміі мастацтваў.

Да родных у сям'і Каржовых ставяцца вельмі паважліва. Таму і дочкі носяць імёны не нейкіх там замежных ці айчынных зорак, а менавіта прабабуль. І так супала, што дзяўчынак завуць, як царскіх княжон Раманавых — Марыя, Вольга і Анастасія. Хаця ніхто такой мэты перад сабой не ставіў.

Можна любавацца, а можна з'есці .

## МАМЫ, ЯК ГУЗІКІ: НА ІХ УСЁ ТРЫМАЕЦЦА

Пакуль іншыя маладыя хлопцы і дзяўчаты жывуць для сябе да 30 з лішкам гадоў, не адважваючыся ўзяць на сябе адказнасць па выхаванні дзяцей, Таццяна з Максімам атрымліваюць асалоду ад шчасця бацькоўства.

— Нічога не трэба баяцца, бо ўсё даецца небам, — лічыць Таццяна. — Мы нясём той крыж, які нам па сілах. Радуйцеся, нягледзячы ні на што. І жыць будзе значна прасцей. У нас не было ні хвіліны сумнення. Мы хацелі вялікую сям'ю, і мы яе атрымалі. Самі прабівалі сабе дарогу ў жыцці. Спачатку толькі муж зарабляў грошы, працуючы ў прыватнай фірме ад відна да відна, а я сядзела з дзецьмі. Ліфта няма, спускаюся з пятага паверха з каляскай, цягну на сабе дзяцей. Калі старэйшай споўнілася 4 гады, а малодшай год, пайшла працаваць. Неяк на дзень нараджэння зрабіла торт і раптам зразумела — гэта ж маё, тое, чым трэба займацца.

Гледзячы на аптымістычную разважлівую Таццяну, здзіўляешся: «І як яна толькі ўсё паспявае?». Ёй усяго 30 з «хвосцікам», а яна шматдзетная маці, таленавітая майстрыха, клапатлівая гаспадыня, мае вышэйшую адукацыю. І пры гэтым вельмі шчырая, спагадлівая, пяшчотная. Запэўнівае, што цалкам шчаслівая. Няўжо такога выпадку, калі рукі апускаюцца, не бывала?» — здзіўляюся я.

— Страх, сумненне — гэта грэх, — запэўнівае Таццяна. — Вельмі часта здаецца, што сілы на мяжы, а потым усё праходзіць і становіцца лягчэй. Я не маю права ўпадаць у дэпрэсію, я ж адказваю за сваіх дзяцей. Нядаўна прачытала, што мамы, як гузікі: на іх усё трымаецца. Вельмі трапнае выказванне. У школе, інстытуце чытала шмат чаго, уражанні запісвала ў асобны сшытак. Бацька з дзяцінства навучыў весці дзённік. Твор магу не помніць, а вось эмоцыі звязаныя з ім, засталіся.

У вялікай сям'і дзеці рэдка вырастаюць эгаістамі. Вось і ў Каржовых дзяўчынкі, хоць і маленькія, разважлівыя не па гадах. Дзевяцігадовая Маша на пытанне, як ёй жывецца, адказвае па-даросламу: «У мяне ўсё ёсць, мне ўсяго хапае».

У іх сціплай двухпакаёўцы сумна не бывае. І вольны час яны бавяць зусім не каля тэлевізара. Яго наогул няма. Сем гадоў таму Таццяна з Максімам заўважылі, што вельмі добра могуць абыходзіцца без яго і завезлі на лецішча. І здзейснілі запаветную мару — купілі вялікі стол. За ім і адбываюцца ўсе галоўныя ў іх жыцці падзеі. Можна, напрыклад, згуляць з дзецьмі ў настольную гульню або запрасіць на свята шмат гасцей.

А яшчэ ў сям'і ёсць прыгожы рытуал. Вечарам яны ўсе разам садзяцца за свой вялікі стол, выключаюць святло і пры свечках п'юць гарбату. У такія хвіліны пра справы ніхто нават не ўспамінае. Яны ёсць, але хай пачакаюць.

— Калі пытаюцца, як я ўсё паспяваю, прызнаюся, што не паспяваю, — усміхаецца Таццяна. — Работа, дом, дзеці — гэта, вядома, цяжка. А зараз у мяне яшчэ і свая школа — «Цукровая кветка»: вучу людзей упрыгожваць тарты вытанчанымі элементамі з цукру. Практычна ўсе «Хлебпрамы» прайшлі ў мяне навучэнне. Гэта шчасце, калі ты запатрабаваны. Якая тут можа быць дэпрэсія? Калі нехта пакутуе ад яе, хай нагрузіць сябе працай па самую макушку. І сумаваць часу не будзе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота з сямейнага архіва КАРЖОВЫХ.**

На конкурсе супермаму падтрымлівалі муж і дочкі.

## 6 фактаў з жыцця Таццяны Каржовай

1. **Яна стварае тарты незвычайнай прыгажосці і складанасці.** Апошняе тварэнне — перавернуты торт, падвешаны да люстры. Такога яшчэ ніхто ў Беларусі не рабіў. Важыць эксклюзіў 20 кілаграмаў, адных яек на яго пайшло 85 штук.
2. **Тарты Таццяны ўражваюць не толькі знешнім выглядам, але і смакам.** Яна дасягае яго за кошт падбору розных складальнікаў, найперш за ўсё садавіны. На жаль, кавярні, дзе можна было б паласавацца гэтымі вырабамі мастацтва, пакуль няма. Але гэта — справа часу. Пакуль рабіце заказы. Самы танны торт каштуе з разліку 350 тысяч рублёў за кілаграм: гэта ж твор мастацтва, дызайнерская праца.
3. **Аднойчы ў самым пачатку дзейнасці адбыўся непрыемны канфуз.** Таццяне замовілі торт, а праз некалькі дзён яна ўбачыла яго... на выстаўцы ў Мінску. У рэспубліканскім конкурсе кандытараў, пра які Каржова і не ведала, ён заняў другое месца. Праўда, вытворца быў указаны іншы. Аўтарка не чакала такога нахабства і папрасіла патлумачыць, што б гэта значыла. Скончылася справа тым, што вынікі конкурсу былі прызнаны несапраўднымі.
4. **Перыядычна сям'я Каржовых займаецца дабрачыннасцю, перадае сваю салодкую выпечку ў розныя дзіцячыя дамы ці інтэрнаты.** Сёлета спяклі вясельны торт у падарунак маладым з Рэсцянскага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў, што ў Чавускім раёне.
5. **Самая вялікая мара Таццяны... нарэшце выспацца.** Яна вельмі абавязковы чалавек. Калі дала слова, трымае. Ахвяруе асабістым часам. Бывае, што на сон застаецца ўсяго 3-4 гадзіны. Але мяняць нічога не збіраецца. Пакуль Бог дае сілы.
6. **У Таццяны часта пытаюцца: «Каржова — гэта псеўданім?».** Яна не стамляецца паўтараць, што гэта — прозвішча. Шчаслівы выпадак, калі прозвішча вызначае прафесію. У дзяводстве яна была Ганчарук. Таксама невыпадкова. Сярод продкаў сустракаліся не толькі спевакі і мастакі, але і ганчары.

## Кексы ад Каржовай

*Цукровыя кветкі, якія вырабляе Таццяна, незвычайна прыгожыя. Але гэтаму трэба вучыцца і мець спецыяльны набор інструментаў. Калі ёсць жаданне асвоіць «смачную» навуку, можна запісацца на курсы на сайце Korzhova.by. А для чытачоў «Сямейнай газеты» кандытар прапануе майстар-клас па выпечцы фірменных кексаў.*

***Спатрэбіцца:*** 175 грамаў мукі, 150 мілілітраў малака, 100 грамаў цукру, 1 яйка, 60 мілілітраў раслінная алею, 45 грамаў какавы, 10 грамаў разрыхляльніку і 2 грамы солі.

**1. Замешваем цеста.** Асобна ўзбіваем яйка і злучаем яго з алеем. Змешваем прасеяную муку, цукар, какаву, разрыхляльнік, соль і дабаўляем да яечнай сумесі. Уліваем малако і добра вымешваем да аднароднай кансістэнцыі.

**2. Выкладваем сумесь у формачкі для мафінаў і ўпрыгожваем ягадамі чорнай парэчкі.**

**3. Ставім у духоўку і выпякаем 20-25 хвілін пры тэмпературы 200 градусаў.**

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

### ЛОТ 1

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | - капитальное строение, инв. № 400/С-69051 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 220,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/2;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-69021 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 243,9 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/1;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-69106 (назначение – здание многофункциональное), площадью 1209,3 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-97342 (назначение – сооружение неустановленного назначения), площадью 2070,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий столярной мастерской, блока складов и механического цеха, склада КиПа;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-97348 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 68,6 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока складов и механического цеха;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-97337 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 81,3 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая канализационная сеть к блоку складов;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-97332 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 104,5 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к блоку складов и механическому цеху;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-97387 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 228,7 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10кВ до ТП-3 до ТП-4;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-97379 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 61,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к блоку складов и механическому цеху;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-85886 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 343,9 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- шкаф распределительный ПР-24-7208;<br>- трансформаторная подстанция 2 РТ 1000/10 № 1;<br>- распределительный пункт ПР-24-11-7205;<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;<br>- распределительный пункт ПР-24-7210-54УЗ;<br>- теплосчетчик ТЭМ 05м, ДУ=80;<br>- теплосчетчик ТС-07ХХ-88 «Струмень»;<br>- туя (1 единица). |
— Адчуваецца энергія людзей, якія змагаліся за гісторыю нашых мясцін. Калі мы яе падтрымаем, то іх прамяністасць перадасца і нам, — упэўнена жанчына. — Я вельмі паважаю суполкі, якія займаюцца беларускай культурай і гісторыяй. Мая мара — зрабіць імпрэзу, прысвечаную мэцэнатцы, заснавальніцы астранамічнай абсерваторыі ў Вільні Эльжбеце Пузыні (Агінскай), і прайсціся паланэзам па Лучайскіх мясцінах, дзе яна жыла.

**Кацярына РАДЗЮК**

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ПРЫЗЁРЫ, АДГУКНІЦЕСЯ!

**Цэлы год мы гарталі сямейныя альбомы і згадвалі цікавыя моманты з жыцця продкаў разам з удзельнікамі конкурсу «Фотаздымак з гісторыяй». Варта сказаць, што актыўнасць зашкальвала. Лісты, як электронныя, так і «ад рукі», з дарагімі сэрцу чорна-белымі фотакарткамі ішлі да нас з Докшыцкага, Свіслацкага, Бялыніцкага, Лельчыцкага, Гомельскага раёнаў, Мінска, Магілёва, Жодзіна, Краснаполля, Баранавічаў, Барысава, Чавусаў. Часам з іх нават утваралася «чарга» на месца ў наступным нумары «Сямейнай газеты». Некаторыя допісы з аповедам пра блізкіх людзей краналі да слёз, некаторыя — адкрывалі новыя старонкі гісторыі, давалі бясцэнныя ўрокі жыцця. Надзвычай парадавала, што сярод удзельнікаў конкурсу — тры школьніцы. Цудоўна, што ёсць яшчэ моладзь, якая распытвае сваіх бабуль і занатоўвае іх каштоўныя ўспаміны. Бо, не сакрэт, з трывалымі каранямі па жыцці крочыць лягчэй.**

Перш чым назваць прызёраў, хацелася б падкрэсліць, што кожны, хто далучыўся да конкурсу, ужо з'яўляецца пераможцам. Вы зрабілі важную справу, што падзяліліся сваімі гісторыямі. Па-першае, таму што чалавек жывы, пакуль жыве памяць пра яго. Як піша адзінаццацікласніца Ганна Варонка: *«На фотакартцы мае продкі назаўсёды застануцца прыгожымі, вясёлымі, некранутымі часам. І якія падзеі ні адбываліся б у будучыні, у гэтае імгненне яны вечныя і заўсёды будуць жыць у маёй памяці...»*

Па-другое, некаторыя допісы яшчэ раз нагадалі чытачам пра вечныя жыццёвыя каштоўнасці, якія не мяняюцца з гадамі. У прыватнасці, «не рабі зло іншым, бо сам згарыш». І гэтую прапісную ісціну пацвярджае павучальная гісторыя, якую распавёў Уладзімір Шулякоўскі. Пра тое, як яго дзядзька, старшы сяржант Пётр Мікуліч, паранены ўцякаў па жыце ад нямецкага танка. *«Губляючы прытомнасць ад страты крыві, Пётр нейкім цудам умудрыўся ў апошні момант адсунуцца ад гатовай вось-вось расплюшчыць яго гусеніцы. Калі немец зразумеў, што занадта ён захапіўся паляваннем на бездапаможнага чалавека, наступіла расплата: з лесу па танку ўдарылі нашы гарматы...»*

Большасць гісторый, дасланых на конкурс, пра вайну, пра пакуты, якія перажылі людзі ў тыя гады. Яны яшчэ раз пацвярджаюць самаахвярнасць нашых дзядоў і прадзедаў, а таксама цярплівасць, адданасць і сілу духу беларускіх жанчын, якія без мужа і часам без даху над галавой ставілі на ногі малых дзяцей...

*«Калі заходзіць гаворка пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны (хоць на вайне з першага да апошняга дня былі мой бацька і яго малодшы брат, хоць загінулі на фронце мой дзед і старэйшы бацькаў брат), я лічу, што самымі вартымі пашаны ветэранамі з'яўляюцца мае бабкі, мая маці і мільёны нашых жанчын, якія на сваіх хворых плячах вынеслі той неймаверны цяжар. І, на вялікі жаль, многім з іх за гэта яшчэ не адплачана...»* — піша афіцэр у адстаўцы Васіль Мікуліч з Барысава.

Амаль у кожным пасляваенным успаміне — пра тое, як было цяжка. Але, тым не менш, муж з жонкай трымаліся за сям'ю, мелі шмат дзяцей, паважалі адно аднаго.

*«На жаль, у сучасным нашым грамадстве аўтарытэт сям'і парушаны, аб чым сведчыць і колькасць разводаў, якая, паводле статыстыкі, стабільна высокая, і мноства шлюбаў без рэгістрацыі (так званае сужыццё, а на мой погляд — звычайная распуста), і колькасць адзінокіх старых, нашых жа бацькоў, якія ў найлепшым выпадку знаходзяць прытулак і спачын у дзяржаўных установах-інтэрнатах...* — разважае адзін з удзельнікаў конкурсу Валерый Гаўрыш з Чавусаў. — *Трэба наноў ствараць культ сям'і! Няхай жа фотаздымкі з гісторыяй прымусяць задумацца аб галоўных каштоўнасцях нашага кароткага зямнога веку — аб міры, сям'і і дзецях, узаемаразуменні — усіх чытачоў «Звязды».*

Абсалютная большасць надрукаваных у рубрыцы фотаздымкаў з гісторыямі настолькі цікавая, захапляльная і розная па змесце, эмацыйным пасыле, што вылучыць кагосьці аднаго было нерэальна... Менавіта таму ў нас па добрай традыцыі некалькі прызёраў.

Найбольш сімпатый набрала **Ганна ВАРОНКА з аграгарадка Нязбодзічы Свіслацкага раёна:** адзінаццацікласніца даслала вельмі цікавыя здымкі (найстарэшы з іх 1898 года) і распавяла пракручастую гісторыю жыцця сваёй прапрабабулі, якая, згодна з сямейнай легендай, з'яўляецца пазашлюбнай дачкой цара Аляксандра II **(«Няпросты лёс дамы з сабачкам», 30 07.2015)**. Акрамя таго, прызёрамі сталі:

— **Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ з Мінска** — з гісторыяй пра цудоўнае выратаванне свайго дзядзькі Пятра Мікуліча **(«Паляванне ў жыце», 16.07.2015).** Ён да таго ж самы актыўны ўдзельнік конкурсу: Уладзімір даслаў у рэдакцыю ажно два цікавыя фотаздымкі з гісторыяй.

— **Наталля ФІЦНЭР з вёскі Буйнавічы Лельчыцкага раёна,** якая падзялілася з чытачамі «Сямейнай газеты» «маціным і бацькавым багажом», з якім яна крочыць па жыцці **(«Жыві і помні...», 11.06.2015)**.

— **Юлія ЯНУКОВІЧ з вёскі Параф'янава Докшыцкага раёна** з гісторыяй трох сёстраў, для якіх моцны падмурак бацькоўскага дома стаў асновай «імуннай сістэмы» супраць вірусаў зла ў самых розных яго абліччах **(«Акенцы ў мінулае», 13.11. 2014)**.

Асобны прыз — за дэталі і гумар (пра тое, як яе тата спаў «на прастоле ў Сталіна», пра 12 абразкоў святых, якія выратавалі яму жыццё падчас бамбёжкі, пра падушку, якую сціскаў брат, быццам граў на гармоніку) — заслужыла **Валянціна ШАРАПАВА, найстарэйшая жыхарка вёскі Старая Беліца Гомельскага раёна («Бацькава спадчына», 22.01.2015)**. Мы наўмысна не размяркоўвалі месцы — кожная гісторыя адметная па-свойму, і абсалютна ўсім аўтарам выказваем вялікую ўдзячнасць. ■

***Шаноўныя прызёры, віншуем вас ад усяго сэрца! Калі ласка, звяжыцеся з рэдакцыяй па тэлефоне 8 (017) 287 17 57 або па электроннай пошце info@zvyazda.minsk.by.***

***А конкурс, які так палюбіўся чытачам, працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавыя фотакарткі з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Як і раней, арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.***

■ Прэм'ера рубрыкі «ЭкаШколка»

# АДНОЙЧЫ ЛЕТАМ, або З чаго пачаць?

***У Гродне з'явілася дзіцячая экалагічная студыя. Гэта нефармальны адукацыйны курс для хлопчыкаў і дзяўчынак ад 4 да 10 гадоў, дзе эколагі і педагогі ў форме гульняў, актыўных лекцый і майстар-класаў расказваюць пра тое, як жыць з мінімальнай шкодай для навакольнага асяроддзя. «Сямейная газета» вырашыла даць магчымасць наведваць экаўрокі дзеткам і іх бацькам з іншых гарадоў і вёсак. Таму і распачынаем новую рубрыку, у якой сваім досведам і невялічкімі майстар-класамі будзе дзяліцца каардынатар студыі Рыма Ушкевіч.***

У НАШЫМ двары я неяк пачула, як адна дзяўчынка крычыць другой: «Пойдзем да дрэва дружбы!»

На ўсялякі выпадак перапытала:

— Да якога дрэва?

— Дружбы! — кажа тая.

— Хто яго так назваў? — не адчапляюся я.

— Мы, — кажа. Потым, быццам падумаўшы, ці можна раскрываць мне сакрэт, цішэй дадала:

— Мы яму падарункі носім...

— Хто вас гэтаму навучыў? — не веру я сваім вушам.

— Ніхто. Мы самі.

Пакуль я скемлівала, што да чаго, яна працягвала:

— Чалавек павінен любіць прыроду, і тады прырода будзе любіць людзей...

Гэта прагучала так кранальна, што я нават праслязілася.

НАШ двор — гэта кавалак выптаптанага зялёнага поля, падаткнутага з ўсіх бакоў дамамі і аўтамабілямі. З кожным годам машын становіцца больш, і яны пераходзяць у наступленне, адкусваючы па невялічкім кавалку газона вакол сябе. На ўвесь двор толькі адна сметніца, памерам з пяцілітровае вядро. Раніцай з акна я штодзень назіраю адну і тую ж карціну: дворнічыха ў апельсінавага колеру куртцы збірае пластыкавыя пакункі ад печыва, сухарыкаў, чыпсаў, абгорткі ад цукерак. І, здаецца, я чую яе праклёны.

Наш двор адзін з мноства двароў у спальных раёнах. Мы пражылі там тры гады, з моманту, калі нарадзіўся мой сын. За гэты час і я, вядома, пазнаёмілася з усімі мясцовымі мамамі: ведала, на што алергія ў Ілы, як спіць Ясенія, ці доўга звыкаўся з новым садком Міша... Амаль усе яны да дзіцячага садка наведвалі цэнтры ранняга развіцця. У іх вучылі маляваць, ляпіць, лічыць, чытаць і пашыралі кругагляд, наколькі гэта магчыма для чалавека аднаго-двух гадкоў. Па-першае, гэта такая мяккая сацыялізацыя жанчыны ў дэкрэце. Па-другое, хочацца для свайго дзіцяці найлепшага сцэнарыя: у маім дзяцінстве ролю развівальнага цэнтра выконвала цётка Лена, якая, абапершыся на бабуліну швачную машынку, гадзінамі слухала каталіцкае радыё «Марыя» і звяртала на мяне ўвагу толькі ў выключных выпадках.

Так што развіццё — гэта цудоўна. Але я за шырокае развіццё, глабальнае.

ЛЕТАМ мы з гарадзенскімі эколагамі ладзілі гульні для дзетак на вялікім Арт-Пікніку. Ідэя адной з іх была ў тым, каб вырубіць лес дзеля пабудовы супермаркета. Дзеткі ад 4 да 10 гадоў павінны былі на нейкі час уявіць сябе ляснымі жыхарамі, што пакутуюць ад лесарубаў, якія кавалак за кавалкам адбіраюць іх тэрыторыю. Але, насуперак нашым чаканням, «жывёлы» разам узбунтаваліся і не далі нам іх прагнаць, не далі нашым планам па пабудове супермаркета здзейсніцца. Тады я падумала, што да маёй ідэі, мажліва, саспеў інтарэс. Так праз некалькі месяцаў узнікла дзіцячая экалагічная студыя.

Зараз мы кожныя выхадныя ладзім сустрэчы для дзетак і бацькоў у Гродне — усе разам вывучаем нешта цікавае пра свет вакол нас. І, натуральна, дзейнасць людзей. Мы прыхільнікі пазітыўнага мыслення і прапаноўваем сваім маленькім вучням, як яны самастойна ці з дапамогай бацькоў могуць зрабіць сваю кватэру і свой двор больш экалагічна сяброўскімі, часам проста крышку змяніўшы некаторыя паўсядзённыя звычкі.

Але з чаго пачаць, каб гэта было проста і гарманічна ўлілося ў жыццё?

Па-першае, добра дапамагае звычайнае прыбіранне. Стала зашмат рэчаў? Не выкідайце! Паглядзіце, можа яны спатрэбяцца вашым знаёмым? Прыгатавана зашмат ежы і, верагодна, давядзецца выкідаць? Патэлефануйце сябру, запрасіце на вячэру ці на сняданак. Смецце не змяшчаецца ў адно вядро? Можна пачаць збіраць яго асобна, прынамсі пластык. А раптам і старая каробка ад абутку можа на першы час стаць кантэйнерам для макулатуры.

Захапіце шматразовую торбачку для паходаў у краму: гэта эканоміць безліч пластыкавых пакетаў, якія забруджваюць асяроддзе.

Каб адцягнуць дзіця ад камп'ютара, прапануйце яму сумесны майстар-клас па вырабе кантэйнера для выкарыстаных батарэек. Перад гэтым патлумачце, што выкінутая з агульным смеццем альбо проста на зямлю, яна забруджвае глебу і ваду і прымушае жывёл, якія жывуць паблізу, пакідаць свае дамы. Такі кантэйнер можна за паўгадзіны зрабіць са звычайнай кардоннай каробкі альбо з ПЭТ-бутэлькі, адмыслова размаляваўшы яе.

**Рыма УШКЕВІЧ.** ■

*Оскар Уайльд: «НАЙЛЕПШЫ СПОСАБ ЗРАБІЦЬ ДЗЯЦЕЙ ДОБРЫМІ — ГЭТА ЗРАБІЦЬ ІХ ШЧАСЛІВЫМІ».*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

# ГОЛЬФ ЗБЛІЖАЕ КРАІНЫ

## Нашы спартсмены скончылі сёлетні сезон міжнародным турнірам у Друскінінкаі

**Па ініцыятыве беларускага боку ў літоўскім гольф-клубе «Wolf» прайшлі заключныя спаборніцтвы VI Адкрытага кубка Беларусі па гольфе сярод аматараў. У іх прынялі ўдзел каля шасцідзесяці спартсменаў з Беларусі, Польшчы, Літвы, а таксама група дыпламатаў Літоўскай Рэспублікі на чале з актыўным гульцом — генеральным консулам Літвы ў Гродне Генадзіюсам Мацкелісам. У далейшым такі міжнародны турнір плануецца зрабіць традыцыйным.**

Уладзімір ДРАЖЫН і Надзея ЯРУК.

Друскінінкай быў выбраны месцам правядзення спаборніцтваў невыпадкова: раней паміж Беларускай асацыяцыяй гольфа і Федэрацыяй гольфа Літвы было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. Да таго ж літоўскі горад тэрытарыяльна блізкі да беларускага Гродна, іх узаемадзеянне ў розных сферах налічвае ўжо больш за 20 гадоў і з'яўляецца выдатным прыкладам паспяховага супрацоўніцтва. Цяпер яго можна назваць і спартыўным, такую думку выказаў **кіраўнік Беларускай асацыяцыі гольфа Уладзімір ДРАЖЫН.**

*— Асабліва прыемна знаходзіцца тут, бо ў нашых краін даўнія добрыя адносіны ў сферы палітыкі і эканомікі. Сёння мы пачынаем новы кірунак у супрацоўніцтве — спорт. Да таго ж у гольф-клубе «Wolf» унікальны ландшафт, поле чэмпіёнскага ўзроўню, для беларускіх спартсменаў карысна гуляць на такіх пляцоўках,* — адзначыў Уладзімір Несцеравіч.

Сярод нашых суайчыннікаў найлепшых вынікаў на турніры дамаглася Надзея Ярук, якая набрала 26 ачкоў Stableford і заняла трэцяе месца сярод жанчын. Спецыяльным прызам ад гольф-клуба таксама ўзнагароджаны Андрэй Ярук за найбольшую колькасць ачкоў па выніку Stroke Gross. У якасці падарунка спартсмен атрымаў гадавое членства ў «Wolf Club».

Трыумфатарам спаборніцтваў стаў малады літоўскі спартсмен Паўліус Балтрамонаіціс. А вось чэмпіён Літвы па гольфе Раландас Гайдзіс хоць і не трапіў на п'едэстал, але турнірам застаўся задаволены.

*— Галоўнае тут не перамога, такія спаборніцтвы з'яўляюцца цудоўнай магчымасцю праявіць сябе для маладых спартсменаў,* — адзначыў ён.

Турнір стаў заключным у гэтым сезоне, а значыць, настае час падводзіць вынікі. Уладзімір Дражын падкрэсліў, што гэты год склаўся досыць удала для айчыннага гольфа. Спартсмены ўдзельнічалі як у міжнародных, так і ва ўнутраных турнірах і ўсюды дасягалі нядрэнных вынікаў. Добрую работу правяла і Асацыяцыя, колькасць ахвотных займацца гольфам павялічваецца. Сёння ў Беларусі налічваецца каля 220 дарослых гальфістаў і 50 дзяцей, усе яны прайшлі сертыфікацыю ў айчынным гольф-клубе.

*— Завяршэнне сезона такім турнірам дазваляе нам упэўнена глядзець у заўтрашні дзень. Мы ўжо складаем план мерапрыемстваў на 2016 год. Галоўная наша задача ў наступным сезоне будзе заключацца ў тым, каб падрыхтаваць матэрыяльную базу — гэта найперш за ўсё палі гольф-клуба «Мінск»,* — расказаў кіраўнік асацыяцыі.

Таксама ён адзначыў, што сёння ўжо дасягнута дамоўленасць аб размяшчэнні гольф-палёў у шэрагу абласцей краіны. Цікавасць да гэтага віду спорту ўзрастае, а значыць, Асацыяцыі трэба ствараць умовы для людзей, якія жадаюць гуляць у гольф. У першую чаргу праца ў 2016 годзе будзе накіравана на школьнікаў, навучэнцаў ліцэяў, гімназій, каледжаў і студэнтаў ВНУ.

Новы сезон плануецца адкрыць у канцы красавіка або на пачатку мая. Беларускі бок гатовы да арганізацыі шэрагу не толькі ўнутраных, але і міжнародных турніраў, з прыцягненнем спартсменаў з краін блізкага замежжа.

Значныя поспехі гольфа ў Беларусі адзначыў і чалавек, які пачаў развіваць гэты спорт у нашай краіне яшчэ ў 2013 годзе, **прафесійны трэнер (golf-pro PGA) Эгідыюс БАЛЕЙШЫС.**

*— Некалькі гадоў я не быў у Беларусі, але бачу выступленне вашых спартсменаў на спаборніцтвах. У вас ёсць вялікі патэнцыял, трэба толькі абраць правільныя напрамкі развіцця, вызначыць прыярытэты, і праз 5 гадоў мы пачуем пра беларускіх гальфістаў.*

*Важна і тое, што гольф уключаны ў алімпійскую праграму, як вядома, на такіх спаборніцтвах дамагаюцца не толькі спартыўных поспехаў, але і фарміруюць імідж краіны. У вас ужо ёсць вядомыя спартсмены з біятлона, хакея, тэніса, з'явяцца і з гольфа. Беларусь — спартыўная краіна, шмат увагі спорту надае кіраўніцтва, гэта вельмі добра. Акрамя таго, развіццё гольфа прыцягне да вас новую цікавасць, турыстаў, а значыць, добра паўплывае на эканоміку, тут усё ўзаемазвязана.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*
*г. Друскінінкай, Літва.*



■ Інфарм-укол

# РАДАСЦЬ МАЯ, ВЯРНІСЯ!

**КОЖНЫ раз, калі мы ўсведамляем, што маем не тое, што хочацца, кожны раз, калі расцэньваем сітуацыю як пагрозу нашаму дабрабыту, нашай самаацэнцы, у арганізме аўтаматычна ўзнікае напружанне. Гэта ёсць стрэсавая рэакцыя. У стрэсу ёсць два складнікі: першая — сама стрэсавая сітуацыя, другая — наша стаўленне да гэтай сітуацыі. Дастаткова выдаліць любую — і стрэс абязброены!**

Вядома, не заўсёды ёсць магчымасць пазбавіцца сітуацыі, якая выклікае стрэс, а таму найлепшым варыянтам будзе змяненне стаўлення да праблемы, так лічыць **загадчык аддзялення памежных станаў Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы Аляксандр БАБЫЛЁЎ.** Вялікую дапамогу тут акажуць розныя метады псіхатэрапіі.

Аднак існуюць не толькі псіхалагічныя, але і фізіялагічныя прычыны стрэсу: лішак кафеіну, дэфіцыт магнію, вітамінаў групы В, надта высокая або нізкая тэмпература, рэзкае змяненне атмасфернага ціску, геамагнітная бура, вірус грыпу, недахоп кісларoду і іншыя, якія ўздзейнічаюць на арганізм, нават калі мы гэтага не ўсведамляем. І паколькі яны парушаюць у арганізме раўнавагу, то выклікаюць стрэс, неабходны для адаптацыі да змяненняў. Прыстасоўвацца, адаптавацца, змяняцца неабходна абавязкова, бо стрэс прыкладае «сваю руку» да велізарнай колькасці захворванняў.

Бяссонніца, дыстанія, неўроз — зразумела. Але існуе і цэлы шэраг так званых псіхасаматычных захворванняў: імунадэпрэсія (прыгнечаны імунітэт), экзэма, крапіўніца, псарыяз, боль у спіне, галаўны боль, мігрэнь, рэўматоідны артрыт, астма, гіпертанія, арытмія, ішэмічная хвароба сэрца, атэрасклероз, цукровы дыябет, захворванні шчытападобнай залозы, язвавая хвароба і інш.

### Звярніце ўвагу, як наша цела можа рэагаваць на празмернае напружанне:

- Адсутнасць апетыту або пастаяннае пераяданне.
- Частае расстройства стрававання, пякотка.
- Бяссонніца.
- Пастаяннае пачуццё стомленасці.
- Павышаная патлівасць.
- Нервовы цік.
- Грызенне пазногцяў.
- Галаўны боль.
- Мышачныя сутаргі.
- Млосць.
- Цяжкасці з дыханнем, страта прытомнасці.
- Слязлівасць.
- Імпатэнцыя, фрыгіднасць.
- Няздольнасць доўга заставацца на адным месцы.
- Павышэнне артэрыяльнага ціску і інш.

### А вось як адгукаецца наша псіхіка:

- Пастаяннае раздражненне пры кантакце з рознымі людзьмі.
- Слабасць, хуткая стамляльнасць.
- Пастаянны неспакой і трывога.
- Няздольнасць сканцэнтраваць увагу.
- Цяжкасці з прыняццем рашэння.
- Абыякавасць.
- Страта цікавасці да жыцця, радасці жыцця, песімізм і інш.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## ДАПАМОГУЦЬ ХУТКА ЗНЯЦЬ СТРЭС

**Практыкаванні.** Прагулка (без мэты, без сяброў і магазінаў), прабежка або язда на веласіпедзе, танцы, басейн, тэніс.

**Глыбокае дыханне.** Канцэнтрацыя на працэсе дыхання прымушае забыцца на крыніцу стрэсу, дзякуючы чаму з'яўляецца магчымасць убачыць сітуацыю збоку.

1. Прыміце зручную позу, заплюшчыце вочы. Трымайце спіну прама, каб можна было свабодна дыхаць.

2. Павольна і глыбока ўдыхніце праз нос. Дыхайце грудной клеткай і дыяфрагмай адначасова (жывот не павінен уцягвацца).

3. Павольна і поўнасцю выдыхніце праз рот.

4. Паўтарыце 8 разоў або столькі, колькі будзе зручна.

5. Некалькі хвілін паляжыце спакойна, дыхайце нармальна.

**Расслабленне.** Сядзьце зручна або ляжце і заплюшчыце вочы. Сканцэнтруйцеся на расслабленні кожнай часткі цела, пачынаючы з макушкі і да пальцаў ног. Калі поўнасцю расслабіліся, працягвайце ляжаць/сядзець нейкі час. Цяпер чаргуйце напружанне мышцаў з іх расслабленнем (5-7 секунд напружання, 20-30 секунд расслаблення).

Такая працэдура эфектыўна знімае стрэс і спрыяе моцнаму сну.

**Адарвацца ад паўсядзённасці.** Зрабіць гэта можна па-рознаму. Самае нездаровае і самагубнае — алкаголь і наркотыкі. А самае здаровае і жыццесцвярджальнае...

...паездка ў адпачынак або на выхадныя. Нават два дні далёка ад дому істотна аслабляюць стрэс, аднаўляюць сілы;

...тэатр, кіно, тэлебачанне, кнігі — выдатныя памочнікі. Звярніце пры гэтым увагу, ці не цягне вас пастаянна да нейкага аднаго жанру. Звычайна людзі «без сонца ўнутры» выбіраюць адпаведныя кнігі, перадачы і г.д. Прымушайце сябе пранікацца выключна пазітыўным, а праз нейкі час і жаданне не ўзнікне вярнуцца да «чарнухі»;

...вобразы. Уявіце прыемную карцінку — возера, пляж, лес, раку, што заўгодна, галоўнае, каб вам яно падабалася. Адчуйце ўсе колеры, гукі і пахі. Трымайце вобраз некалькі хвілін;

...медытацыя. Існуе мноства разнавіднасцяў медытацыі, расслаблення свядомасці з дапамогай факусіравання думак. Рэгулярнае прымяненне медытацыі дае адчуванне дабрабыту і спакою.

Усе формы медытацыі ўключаюць тры моманты: зручная пастава, захаванне нерухомага стану і факусіраванне ўвагі на нейкім прадмеце, гуку або працэсе ў самім сабе. Некаторыя людзі медыціруюць з заплюшчанымі вачамі, іншыя глядзяць на прыемны для вока прадмет — карціну або кветку. Галоўнае — усю ўвагу сфакусіраваць на аб'екце, а не на сваёй персоне і сваіх праблемах.

**Біялагічная зваротная сувязь.** Стрэс уключае шматлікія змяненні ў арганізме, якія выяўляюцца з дапамогай прыбораў. Чалавек можа навучыцца свядома кіраваць некаторымі функцыямі, непасрэдна звязанымі са стрэсам.

**Гіпноз.** У гэтым псіхалагічным стане ўспрыманне, памяць і паводзіны суб'екта змяняюцца адпаведна ўнушэнню.

**Масаж.** Карысны і калі яго робяць блізкія або спецыялісты, і калі вы робіце яго самі. Самамасаж галавы, шыі, плячэй, ступняў прыносіць імгненную палёгку.

**Зніжэнне тэмпу жыцця.** Здаецца, не патрабуе тлумачэння.

**Перагляд жыццёвых пазіцый.** Не варта губляць час і энергію на дасягненне мэты, якая на самай справе не такая ўжо і важная для вас.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже административного помещения, принадлежащего МОАО «Красный металлист»

| Лот №1 | Административное помещение с инв. № 700/D-137723. Г.п. – 1973. Площадь – 1820,2 кв.м. Помещение расположено на 1-3 этажах. Частично обременено правом аренды | Могилевская обл., г. Могилев, ш. Гомельское, 15А-1 | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 7 068 086 520 | 70 000 000 | 5 |

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 6,0972 га с кадастровым номером 740100000007004614. Целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Выделение земельного участка будет осуществляться в случае необходимости в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 14 (четырнадцати) календарных дней с даты подписания договора купли-продажи.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 55 000 000 (Пятьдесят пять миллионов) белорусских рублей в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 15.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Могилев, Гомельское шоссе, 15а, МОАО «Красный металлист», зал заседаний.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже административного помещения МОАО «Красный металлист»,* **проводимом 15 декабря 2015 г.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений **11.12.2015 в 12.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Павлов Руслан Александрович, 8 (029) 172-93-49, 8 (029) 646-13-38.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## (о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом № 10 по генплану»)

**Информация о застройщике**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства – 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
7. Жилой дом № 28 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
8. Жилой дом № 7 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
9. Жилой дом № 9 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 8 месяцев.
10. Жилой дом № 32 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 11 месяцев.
11. Жилой дом № 11 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
12. Жилой дом № 85 по ул. Неманской, фактический срок строительства – 18 месяцев.
13. Жилой дом № 21 по ул. Налибокской, фактический срок строительства – 18 месяцев.
14. Жилой дом № 24 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
15. Жилой дом № 60 по ул. Каменногорской, фактический срок строительства – 11 месяцев.
16. Жилой дом № 34 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 8 месяцев.

**Информация о проекте и об объекте строительства**

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе с привлечением к строительству 70% общей площади жилых помещений граждан из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска.

Положительные заключения государственной экспертизы от 11.02.2014 № 1182-15/13; от 14.08.2015 № 608-15/15.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 10 по генплану в застройке микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь строительства.

**Характеристика объекта**

Объект – 113-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М111-90 со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: **1-2-комнатные квартиры – 18 000 000 руб.**

Оплата поэтапная.

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 24 сентября 2014 г. № 500/1393-3955. Площадь земельного участка – 0,0798 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 113.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности: помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 2-й квартал 2015 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 3-й квартал 2016 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Строительство осуществляется согласно Указу Президента № 263 от 6 июня 2013 г. Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 28 квартир, из них 2 однокомнатные квартиры общей площадью 45,17 м² жилой площадью 17,96 м², 12 однокомнатных квартир общей площадью 44,92 м² жилой площадью 17,96 м², 4 двухкомнатные квартиры общей площадью 60,32 м² жилой площадью 31,09 м², 5 двухкомнатных квартир общей площадью 60,57 м² жилой площадью 31,09 м², 5 двухкомнатных квартир общей площадью 68,20 м² жилой площадью 31,09 м².

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205 а, кабинет № 1, тел. 207 19 15) с 19 ноября 2015 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

**Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» www.mapid.by.**

## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007,
г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15,
(+375 33) 309 15 15

### КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | За 30 сентября 2015 года | За 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 284 884 | 237 525 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 2 682 413 | 2 779 223 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 319 111 | 362 123 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 598 221 | 51 045 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 8 821 276 | 6 474 299 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 344 | 638 760 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 23 | 22 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 473 254 | 489 815 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 24 614 | 28 353 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 3 357 | 3 357,0 |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 225 787 | 142 645 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | 13 433 284 | 11 207 167 |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | 609 415 | 504 882 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 3 947 550 | 4 289 265 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 7 189 374 | 4 589 141 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 29 007 | 75 860 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 2 287 | 3 018 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 317 879 | 263 120 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 12 095 512 | 9 725 286 |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 779 620 | 779 620 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | 34 320 | 34 320 |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 82 563 | 76 721 |
